Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 СНЕЖНЯ 2016 г. СУБОТА № 234 (28344)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Мінск не згубіць свой «Вянок»**

СТАР. 9



**Разьбяная ліштва – сусвет на тваім акне**

СТАР. 12



**«Еўрабачанне – 2017»: здзівіць і «адарвацца»**

СТАР. 13

# СНЕЖАНЬСКІ «ЎРАДЖАЙ»



Фота БЕЛТА.

У Мазырскім доследным лясгасе ва ўсю рыхтуюцца да навагодніх свят. У спецыялізаваным гадавальніку Слабадскога доследна-вытворчага лясніцтва, дзе вырошчваецца больш за тры тысячы саджанцаў, пачалі адбор і сартаванне дрэўцаў, каб напярэдадні Новага года можна было аператыўна высекчы і прапанаваць елкі ў продаж. Зялёныя прыгажуні паедуць адсюль у Мазыр, Гомель, Калінкавічы. У майстра лесу Марыі КАЧЭНІ, якая працуе на адборы, добры настрой: яна ведае, што яе гадаванцы прынясуць людзям радасць.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр**

*«Кіраўніцтва кампаній звяртае ўвагу ўрада на адно істотнае пытанне — магчымасць прыцягнення крэдытных сродкаў па як мага больш нізкіх крэдытных стаўках. Гэта агульнаэканамічная праблема, якая патрабуе вырашэння. Урад паслядоўна вырашае гэтую задачу. Па новых крэдытах, якія выдаюцца ў беларускіх рублях, на пачатак года працэнтная стаўка была каля 33%, цяпер гэта 21—22%. Ёсць цэлы шэраг прадпрыемстваў, у якіх стаўка значна меншая — 17—18%. Задача заключаецца ў тым, каб да канца наступнага года гэтыя 17—18% гадавых былі для ўсіх тых, каго можна крэдытаваць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9703 | ▲ |
| Еўра | 2,1019 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0307 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0760 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

## БАНК ПРАВА

### НЦПІ забяспечвае стабільнае развіццё дзяржаўнай сістэмы прававой інфармацыі

**Першая нядзеля снежня — традыцыйна святочная для ўсіх прафесійных юрыстаў. Напярэдадні гэтай даты «Звязда» пагаварыла з дырэктарам Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі, кандыдатам юрыдычных навук, дацэнтам Яўгенам КАВАЛЕНКАМ пра прававую інфарматызацыю ў краіне і ролю, якую адыгрывае ў Беларусі падначаленая яму арганізацыя.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

***— Яўген Іосіфавіч, найперш раскажыце, якія функцыі ўскладзены на Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі?***

— Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі — гэта цэнтральная навукова-практычная арганізацыя, якая ажыццяўляе збор, улік, апрацоўку, захаванне, сістэматызацыю і актуалізацыю эталоннай прававой інфармацыі, яе распаўсюджванне. Іншымі словамі, забяспечвае функцыянаванне і развіццё дзяржаўнай сістэмы прававой інфармацыі.

СТАР. 4

■ Сацыяльныя праекты

## ЗаПРАГРАМАваць на жыццё

### Для інвалідаў створаць IT-курсы і дапамогуць знайсці прэстыжную работу

**На сталічным кірмашы вакансій, што праходзіў у лістападзе, у секцыі «Занятасць без межаў» прапаноўвалі работу інвалідам. Іх гатовы былі ўладкаваць дыспетчарамі, сантэхнікамі, адміністратарамі вэб-сервера. Героі гэтага матэрыялу ўпэўнены: спіс прафесій, дзе можа сябе праявіць чалавек з асаблівасцямі ў развіцці, куды большы. І гатовы дапамагчы іншым знайсці работу. На сёлетнім конкурсе сацыяльных праектаў Social Weekend прэзентуюць адразу два адукацыйныя курсы для людзей з інваліднасцю.**



«НАС АРЫЕНТУЮЦЬ НА ЗАВОД»

Нядаўна **Максім МОЛНАР** атрымаў прэстыжную прафесію — 3D-дызайнер. Цяпер хлопец спрабуе ўладкавацца на работу: адна амерыканская фірма выслала яму тэставае заданне. Прызнаецца, што ў ідэале хацеў бы працаваць у гульнявой сферы, у кампаніі, дзе ў калектыве ёсць людзі, якія чуюць і якія не.

СТАР. 7

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ІНІЦЫЯТЫВА, ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ І АДКАЗНАСЦЬ

## На сёння менавіта яны вызначаюць поспех

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды працаўнікам розных сфер. Цырымонія адбылася ўчора ў Палацы Незалежнасці. Гэта першае з шэрагу мерапрыемстваў па ўшанаванні найлепшых працаўнікоў па выніках пяцігодкі.**

Ордэнаў і ганаровых званняў удастоены 36 чалавек за шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў у прамысловасці, сельскай і лясной гаспадарцы, значны асабісты ўклад ва ўмацаванне міжнацыянальных адносін, навуковай дзейнасці, сферы аховы здароўя, мастацтва, культуры і спорту.

Цёплыя словы ўдзячнасці Аляксандр Лукашэнка адрасаваў тым, хто звязаў свой прафесійны лёс з вытворчай сферай. Гэта работнікі прадпрыемстваў, якія па праву лічацца беларускімі брэндамі. «Іх прадукцыя запатрабавана не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. На прадпрыемствах актыўна ўкараняюцца перспектыўныя распрацоўкі, новыя тэхнічныя рашэнні, што дазваляе павысіць якасць прадукцыі, знізіць яе сабекошт, энерга- і рэсурсаёмістасць, — адзначыў Прэзідэнт. — На жаль, далёка не на ўсіх прадпрыемствах. Мы нядаўна разглядалі гэтыя праблемы на прыкладзе машынабудаўнічай галіны».

«Вашы дасягненні ў цяперашні няпросты час сведчаць аб тым, што сапраўдным залогам поспеху з'яўляюцца ініцыятыва, прафесіяналізм і адказнае стаўленне да справы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Узнагароды ўручаны работнікам аграпрамысловага комплексу, якія, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, годна гарантуюць харчовую бяспеку краіны і важка папаўняюць валютныя рэсурсы. Сярод найлепшых гаспадарак — СВК «Агракамбінат Сноў», які летась быў прызнаны лідарам у вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі. Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў заслугі ААТ «Лазовічы» Клецкага раёна і СВК «Світанак» Кіраўскага раёна.

На цырымоніі таксама прысутнічала вялікая група прадстаўнікоў сілавых структур, сярод якіх ваеннаслужачыя і супрацоўнікі Міністэрства ўнутраных спраў. «Менавіта на вас ускладзена выключна важная місія гарантавання бяспечных умоў жыцця грамадзян, законнасці і правапарадку ў грамадстве, надзейнай абараназдольнасці краіны. Прыміце словы ўдзячнасці за тое, што аберагаеце самае дарагое для чалавека, грамадства, краіны — мір і спакой у нашых дамах», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У ліку ўзнагароджаных — урачы, прадстаўнікі калектываў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра эпідэміялогіі і мікрабіялогіі, Мінскага абласнога радзільнага дома, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Даніну павагі Аляксандр Лукашэнка аддаў і тым, хто праслаўляе Беларусь спартыўнымі дасягненнямі. «Няхай іх апошнім часам стала не так шмат, але яны ёсць», — адзначыў ён. Ганаровых званняў удастоены спартсмены, якія заваявалі медалі на міжнародных спаборніцтвах, група трэнераў, якія выхоўваюць новых чэмпіёнаў і шырока прапагандуюць сярод насельніцтва спорт і здаровы лад жыцця.

Культурную сферу на мерапрыемстве прадстаўлялі артысты Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнт падзякаваў ім за тое, што яны нясуць грамадству ідэалы сапраўднай прыгажосці, гармоніі і высокага мастацтва.

«Сёння вы набылі сапраўды ўсенароднае прызнанне за заслугі перад Радзімай. Няхай успаміны пра гэтыя дзень стануць для вас стымулам да новых дасягненняў», — пажадаў кіраўнік дзяржавы.

■ Парламенцкі дзённік

# НАШУ КРАІНУ НАВЕДАЕ ДЭЛЕГАЦЫЯ ПОЛЬШЧЫ

**Рабочы візіт прадстаўнікоў гэтай краіны адбудзецца па запрашэнні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Дэлегацыю ўзначаліць маршал Сената Рэспублікі Польшча Станіслаў Карчэўскі.**

Праграма візіту прадугледжвае сустрэчы кіраўніка дэлегацыі са старшынёй Савета Рэспублікі Міхаілам Мясніковічам, старшынёй Палаты прадстаўнікоў Уладзімірам Андрэйчанкам. Акрамя гэтага, запланавана наведванне Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, удзел маршала Сената Польшчы ў пасяджэнні сесіі Савета Рэспублікі, сустрэча са студэнтамі і выкладчыкамі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, прадстаўнікамі сярэдніх школ Мінска, у якіх вывучаецца польская мова, наведванне Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі, а таксама палацава-паркавага ансамбля музея-запаведніка «Нясвіж».

Польскія парламентарыі будуць знаходзіцца ў нашай краіне з 4 па 6 снежня.

**Раман АЛЯХНОВІЧ** ■

■ Тры пытанні да ўлады

# ГОМЕЛЬ ТРЫМАЕ ЛІДАРСТВА

## Старшыня гарвыканкама пра будучыню і дзень сённяшні горада над Сожам

**Гомелю ўручаны пераходны вымпел пераможцы Рэспубліканскага агляду ў намінацыі «Лепшы абласны горад па санітарным стане і ўпарадкаванасці» за 2015 год. Горад над Сожам, дзе сёння жыве больш за 530 тысяч чалавек, трэці раз за пяць гадоў удастоены такой высокай ацэнкі. У гэтым заслуга не толькі гарадской улады і адпаведных службаў, але і ўсіх жыхароў абласнога цэнтра, падкрэслівае старшыня Гомельскага гарвыканкама Пётр КІРЫЧЭНКА.**

***— Пётр Аляксеевіч, у чым сакрэт стабільных перамог?***

— Рэцэпт даволі просты — гэта сумесная сістэмная праца як кіраўнікоў на месцах, усіх працоўных калектываў, так і гараджан. Самае галоўнае — імкненне кожнага гамяльчаніна зрабіць свой унёсак у наведзенне парадку. За апошнія дзесяцігоддзе наш абласны цэнтр прыкметна змяніўся. Як пастаяннае месца жыхарства яго абірае ўсё больш моладзі. Таму не дзіўна, што за апошнія гады ў Гомелі з'явілася шмат новых паўнавартасных мікраараёнаў. Гэта мікраараёны №№19, 20, 22, 20а. Таксама працягваецца забудова мікрараёнаў №№104, 94, 96, 59, 59а, 18. Засвоены пляцоўкі пад сядзібнае жыллёвае будаўніцтва ў раёне вёскі Раманавічы і пасёлка Чырвоны Маяк, Хутар, Хімы.

***— Які кірунак горадабудаўнічай палітыкі на бліжэйшую перспектыву?***

— Сёння распрацаваны дэтальныя горадабудаўнічыя праекты па забудове жылых раёнаў «Плёсы», «Паўднёвы», па вуліцах Палескай і Фядзюнінскага, шматкватэрнай і сядзібнай забудовы ў мікрараёне «Касцюкоўка». Сучаснае, вельмі дынамічнае жыццё патрабуе ад нас таксама замены старога жылля на новае, больш практычнае. Так, спецыяльным планаваннем прадугледжана фарміраванне камфортнага жылога асяроддзя ў цэнтры горада за кошт зносу сядзібнай забудовы ў межах вуліц Інтэрнацыянальнай—Гагарына—Пралетарскай—Маісеенка і таксама на вуліцы Барыкіна. Архітэктурнае аблічча тут будзе фарміравацца за кошт шматпавярховых жылых, грамадскіх будынкаў, зялёнай зоны і пашырэння магістральных вуліц. Ад апошняга, дарэчы, мы нікуды не сыдзем, гэта агульнапрынятая сусветная практыка. З павелічэннем колькасці жыхароў, павялічваецца і колькасць аўтатранспарту. Таму летась мы пашырылі да чатырох палос вуліцу Кірава, адкрылі пад'езд да 18-га мікрараёна, які з'яўляецца часткай праекта «Усходні абход», дзве новыя дарогі падведзены да мікрараёна «Юбілейны». Сёлета пашырылі вуліцу Палескую, якая звязвае раён Сельмаша з цэнтрам горада. Да 73-й гадавіны вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў гамяльчане атрымалі абноўленыя вуліцы:



Інтэрнацыянальную, Падгорную і Дакутовіч.

***— Ці ёсць станоўчыя тэндэнцыі развіцця прамысловага комплексу Гомеля? Наколькі стабільна сябе адчуваюць людзі, якія працуюць на вытворчасці?***

— За 10 месяцаў прамысловымі прадпрыемствамі выпушчана прадукцыі на суму больш за 3,9 млрд рублёў. Пры гэтым рэштсі гатовай прадукцыі на складах маюць устойлівую дынаміку зніжэння. Удзельная вага запасаў зменшылася і складае ў сярэднямесячным аб'ёме вытворчасці каля 55%. Выручка ад рэалізацыі за студзень—верасень вырасла да аналагічнага перыяду летась амаль на 12%. Рэнтабельнасць продажаў склала 9,3%. Хачу адзначыць, што гэты паказчык — самы высокі сярод абласных гарадоў. Заробак у працаўнікоў сферы прамысловасці ў верасні склаў 737 рублёў, што вышэй сярэдняга па горадзе больш чым на 5%. Зменшылася на 3,5% у параўнанні з леташнімі паказчыкамі колькасць людзей, якія працуюць няпоўны рабочы час у сферы прамысловасці. На многіх прадпрыемствах заахвочваюць работнікаў істотнымі сацыяльнымі выплатамі.

***— Гомель стабільна ўтрымлівае званне лепшага абласнога цэнтра для вядзення бізнесу. Якія ўмовы створаны для развіцця прадпрымальніцтва?***

— Так, трэці год запар Гомель — найлепшы і ў гэтай намінацыі. Цяпер у горадзе дзейнічаюць чатыры цэнтры падтрымкі прадпрымальніцтва і два інкубатары малога прадпрымальніцтва. Яны аказваюць спецыялізаваную дапамогу суб'ектам прадпрымальніцкай дзейнасці ў вобласці бухгалтарскага ўліку, кансультуюць па пытаннях камерцыйнай дзейнасці і кіравання, арганізоўваюць курсы і даюць у арэнду памяшканні, спецыяльна абсталяваныя пад офісы і вытворчасць. Патэнцыйных пакупнікоў і арандатараў інфармуюць пра наяўнасць аб'ектаў камунальнай маёмасці, якія не выкарыстоўваюцца, але могуць быць прыстасаваны для гаспадарчай дзейнасці. Таксама для стымулявання людзей, якія хочуць пачаць сваю справу, гарвыканкам прапануе бязвыплатныя субсідыі ў памеры каля дзвюх тысяч рублёў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*
■


## РУП «Институт недвижимости и оценки»

• ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
• ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ

**извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды сроком на один год объектов недвижимости, принадлежащих Государственному предприятию «Управляющая компания холдинга «Белавтодор» на праве хозяйственного ведения**

| № лота | Право заключения договоров аренды объектов: | Место нахождения: | Начальная цена продажи права, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Сумма арендной платы в месяц, бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | 1. Административное помещение 1, инв. № 500/D-70786204, площадь – 11 кв.м<br>2. Административное помещение 2, инв. № 500/D-70786205, площадь – 66,4 кв.м<br>3. Административное помещение 3, инв. № 500/D-70786206, площадь – 18,4 кв.м<br>4. Административное помещение 12, инв. № 500/D-70786215, площадь – 19 кв.м<br>5. Административное помещение 13, инв. № 500/D-70786216, площадь – 17,9 кв.м<br>6. Административное помещение 14, инв. № 500/D-70786217, площадь – 17,5 кв.м<br>7. Административное помещение 15, инв. № 500/D-70786218, площадь – 19 кв.м<br>8. Административное помещение 16, инв. № 500/D-70786219, площадь – 37,4 кв.м<br>9. Помещение санитарно-бытового назначения, инв. № 500/D-70786221, площадь – 3,5 кв.м | г. Минск, ул. Кижеватова, д. 8 1-й этаж административно-хозяйственного здания | 857,21 | 85,72 | 3 428,83 | 5 |
| Лот №2 | Помещение санитарно-бытового назначения с инв. № 500/D-70786208, площадь – 13,3 кв.м | г. Минск, ул. Кижеватова, д. 8, пом. 5 | 54,26 | 5,43 | 217,06 | 5 |
| Лот №3 | Помещение санитарно-бытового назначения с инв. № 500/D-70786209, площадь – 39,7 кв.м | г. Минск, ул. Кижеватова, д. 8, пом. 6 | 161,98 | 16,20 | 647,9 | 5 |
| Лот №4 | Помещение транспортного назначения с инв. № 500/D-70786210, площадь – 74,4 кв.м | г. Минск, ул. Кижеватова, д. 8, пом. 7 | 303,55 | 30,36 | 1214,21 | 5 |
| Лот №5 | 1. Административное помещение 8 с инв. № 500/D-70786211, площадь – 39,2 кв.м<br>2. Помещение санитарно-бытового назначения с инв. № 500/D-70786213, площадь – 3,4 кв.м | г. Минск, ул. Кижеватова, д. 8, пом. 8, 10 | 173,81 | 17,38 | 695,23 | 5 |
| Лот №6 | 1. Помещение санитарно-бытового назначения с инв. № 500/D-70786212, площадь – 14,5 кв.м<br>2. Административное помещение 11 с инв. № 500/D-70786214, площадь – 18,4 кв.м | г. Минск, ул. Кижеватова, д. 8, пом. 9, 11 | 134,23 | 13,42 | 536,93 | 5 |

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона, либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот (лоты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), Претендент на покупку должен заключить с Доверителем договор аренды Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Лота (Лотов) в течение 3 (трех) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь и настоящим договором для Победителя аукциона

Расчет ежемесячной арендной платы выполнен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29 марта 2012 г. №150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом». Базовая арендная величина равна 13,60 бел. руб. в денежных знаках образца 2009 г.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 1 000,00 белорусских рублей в денежных знаках образца 2009 года

**Аукцион состоится 05.01.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11 пом. 4**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь и иностранные инвесторы. Порядок проведения аукциона, оформление участия в аукционе, определение лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещение затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.ino.by.**
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже права заключения договора аренды объекта недвижимого имущества (Лот №___), принадлежащего Государственному предприятию «Управляющая компания холдинга «Белавтодор», **проводимом 05 января 2017 г.**
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Лота (Лотов).
Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6.
Окончание приема заявлений – **03.01.2017 в 10.00.**
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом (Объектами) аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Юшкевич Валентина Евгеньевна, 8 (017) 259-84-44.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять Лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

☎ **Организатор аукциона: • +375(17) 306-00-57 • +375(29) 550-09-52 • + 375(29) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

■ Кірмаш ідэй

# «РАЗУМНЫ» ВАЗОН І ШТУЧНАЯ КІСЦЬ

## У сталіцы прадставілі каля ста інавацыйных распрацовак

**Некалькі гадоў таму бацька праграміста Алега Гальцава страціў кісць рукі. Тады малады чалавек даведаўся, што якасныя біянічныя пратэзы нямецкай вытворчасці каштуюць каля 30 тысяч долараў. Зразумела, сума для сямейнага бюджэту вялікая, але было і іншае выйсце — сваімі сіламі распрацаваць штучную кісць, якой было б зручна карыстацца як для штодзённых патрэб, так і для невялікіх фізічных нагрузак. Так у супрацоўніцтве з інжынерам-канструктарам Сяргеем Арэф'евым з'явіўся праект па стварэнні электрамеханічнага пратэза Myotriton, які вынаходнікі прэзентавалі на сталічнай выставе-кірмашы Smart Patent побач з дзясяткамі іншых актуальных распрацовак.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА
На вынаходства біянічнага пратэза Алега ГАЛЬЦАВА падштурхнуў інцыдэнт, які здарыўся з яго бацькам.

— Навучыцца кіраваць такой штучнай кісцю можна літаральна за тры хвіліны, — запэўнівае аўтар праекта. — Атрымліваецца простая і надзейная сістэма, якая каштуе ў разы менш за аналагі з датчыкамі. Ужо цяпер многія звяртаюцца, каб набыць прадукцыю, але пакуль што мы дапрацоўваем прататып, пасля чаго будзем яго сертыфікаваць — гэта абавязковая ўмова для медыцынскай прадукцыі.

— Наша аўтаматызаваная сістэма паліву кветак разлічана на людзей, у якіх хатнія расліны, як кажуць, «не прыжываюцца», — расказвае супрацоўніца Полацкага аграрнага эканамічнага каледжа Ірына Курносава. — Падобныя сістэмы ўжо існуюць, але працуюць па іншым прынцыпе: яны проста паліваюць кветку праз пэўныя адрэзкі часу. У сваю чаргу, наш вазон — «разумны», ён сам аналізуе вільготнасць глебы і вырашае, патрэбен цяпер паліў, ці не. Акрамя таго, улічвае і від расліны, бо, вядома, кактусу не трэба столькі вады, колькі архідэі.

Цяпер аўтары праводзяць мадэрнізацыю распрацоўкі — рэалізоўваюць функцыю, пры дапамозе якой з ноўтбука, планшэта або смартфона можна будзе дыстанцыйна атрымліваць інфармацыю пра жыццё расліны. Так, напрыклад, на тэлефон гаспадара, які знаходзіцца ў камандзіроўцы і хвалюецца за свайго «гадаванца», прыйдзе паведамленне «Прывітанне! Мяне напаілі». Таксама ў перспектыве вазон зможа «размаўляць» з карыстальнікам — клікаць таго паглядзець у акно, адарвацца ад камп'ютара і іншае.

Аляксандр Лук'янаў з універсітэта грамадзянскай абароны МНС прадставіў распрацоўку, якая можа ўратаваць, без перабольшання, тысячы жыццяў. Паводле яго слоў, 80 працэнтаў пажараў у Беларусі пачынаюцца з-за ўзгарання крыніц малой магутнасці (недакуркаў цыгарэт, непатушаных запалак, замыканняў у электраправодцы і гэтак далей). Праблема ў тым, што пры кантакце з такімі матэрыяламі, як тканіна ці лямец, полымя разгараецца вельмі хутка. Мужчына распрацаваў кампазіцыйны састаў на аснове поліэфіраў, апрацоўка якім робіць прадметы абароненымі ад агню, а таксама тэхналогію, якую можна ўкараніць на вытворчасці тавараў з гаручых матэрыялаў.

— Тэхналогія не патрабуе маштабнай мадэрнізацыі вытворчасці, набыцця дарагой тэхнікі за сотні тысяч долараў, — тлумачыць аўтар. — У кожным канкрэтным выпадку мы знаходзім такі этап тэхналагічнага ланцужка, куды можна ўбудаваць нашу тэхналогію без сур'ёзных фінансавых уліванняў. Тэхналогію рэалізавалі праект на такіх буйных прадпрыемствах, як «Магатэкс» і «Камволь».

Адным з самых людных на выставе быў стэнд з прадстаўленай сістэмай з загадкавай назвай «Аватар». Гэта распрацоўка Рэспубліканскага цэнтра інавацыйнай і тэхнічнай творчасці. Праграмна-апаратны комплекс захоплівае міміку і рух рук у рэальным часе і перадае іх на камп'ютар ці прыладу віртуальнай рэальнасці. Таксама «Аватар» праводзіць апрацоўку відэаздымкі з накладаннем розных эфектаў і масак. Менавіта гэта і прыцягвала да стэнда такую актыўную ўвагу: кожны хацеў убачыць сябе ў вобразе камп'ютарнага персанажа. Акрамя таго, дзеянні чалавека можа капіяваць і рэальны робат.

Прывезлі на выставу свае распрацоўкі і студэнты Гомельскага прафесійна-тэхнічнага каледжа электратэхнікі. На суд інвестараў і цікаўных наведвальнікаў яны прадставілі адразу чатыры тэхналогіі. Напрыклад, жалюзі з двума рэжымамі кіравання: ручным — з дапамогай пульта і аўтаматычным — з дапамогай датчыкаў асветленасці. Гэта дазволіць вызначыць аптымальны для таго ці іншага часу сутак рэжым апошняй, а таксама пазбегнуць перагравання памяшкання. На думку юных даследчыкаў, гэтая ніша ў нас у краіне пакуль не занятая. Выстава для іх аказалася карыснай: па парадзе наведвальнікаў вырашылі дадаць у сістэму гадзіннік рэальнага часу.

Кіраўнікі праектаў адзначаюць, што каштоўнасць гэтых распрацовак у тым, што на ўсіх этапах, у тым ліку вынаходства ідэі, імі самастойна займаюцца вучні каледжа. Гэта жывое пацвярджэнне таго, што ўсё інавацыі пачынаюцца з малога.

**Дар'я КАСКО, Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*kasko@zviazda.by, lyskavets@zviazda.by*

■

■ Не прапусці!

# ЗВЫЧАЙНАЕ ЧАРАДЗЕЙСТВА... НАВУКІ

### Фестываль навукі «Дарэчы. Кропкі перасячэння» пройдзе ў Мінску з 7 па 10 снежня

**Праграма мерапрыемства, старт якому будзе дадзены ў Нацыянальнай акадэміі навук, уключае лекцыі і майстар-класы, навукова-папулярныя ток-шоу «Разбяром на атамы: як кацяняты захапілі свет?», «Навука. Смачна: шакаладнае жыццё», прафарыентацыйныя квэсты, турніры па інтэлектуальных гульнях «Што? Дзе? Калі?» і «Матрыца», навукова-папулярнае шоу «Іронія навукі або звычайнае чарадзейства» і іншыя.**

Расійскія і беларускія навукоўцы прачытаюць лекцыі, прысвечаныя перадавым навуковым даследаванням, у тым ліку ў галіне атамнай энергетыкі, раскажуць пра медыцыну будучыні і нейратэхналогіі, пра парадоксы тэорыі верагоднасці і этнаастраномію, палеанталогію і звышправаднікі.

Прафарыентацыйны квэст і экскурсія ў Парк высокіх тэхналогій дапамогуць школьнікам вызначыцца з будучай прафесіяй, а разбор «Зорных войнаў» пакажа, як могуць спатрэбіцца ў жыцці веданне вышэйшай матэматыкі і касмалогіі. Школьнікі змогуць наведаць майстар-класы ў музеі навукі «Элемента», разабрацца, якія крыніцы энергіі найбольш перспектыўныя і эканамічна выгадныя, даведацца пра «плюсы» і «мінусы» атрымання энергіі з дапамогай ветру, сонца і геатэрмальных крыніц, ядзерную энергетыку, фальклор у інтэрнэце, прыкладную гарадскую антрапалогію.

Усе мерапрыемствы праводзяцца пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і расійскай Дзяржаўнай карпарацыі па атамнай энергіі «Расатам». Непасрэднымі арганізатарамі фестывалю выступілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра інавацыйнай і тэхнічнай творчасці і Інфармацыйнага цэнтра атамнай галіны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

■ Добры старт

# ПРАЦЯГВАЮЧЫ ПОСПЕХ

### Уладзімір Чапелін стаў бронзавым прызёрам індывідуальнай гонкі на першым этапе Кубка свету па біятлоне

Шведскі Эстэрсунд прынёс другую ўзнагароду зборнай Беларусі. Гэтым разам прыемны сюрпрыз зрабіў прадстаўнік мужчынскай часткі нашай каманды Уладзімір Чапелін. Як і напярэдадні ў час жаночай гонкі, у мужчынскай спартсменам прыйшлося спаборнічаць у няпростых умовах надвор'я, на стрэльбішчы раз-пораз з'яўляўся парывісты вецер. Аднак гэта не перашкодзіла фаварытам пацвердзіць свой статус. Выйграў гонку француз Мартэн Фуркад, другім фінішаваў нарвежац Ёханэс Бо. Наш Уладзімір Чапелін памыліўся толькі аднойчы, дапусціўшы промах на першым агнявым рубяжы.


Фота Дзяніса КАСЦЮЧЭНКІ.

— *У першую чаргу настройваўся на стральбу, а ўжо потым каб выкласціся да канца на апошнім крузе дыстанцыі,* — адзначыў пасля фінішу Уладзімір. — *У сераду ўважліва і з вялікім хваляваннем назіраў за Дашай Юркевіч. Прасякнуўся гэтым поспехам, зразумеў, што пры добрай стральбе можна змагацца за подыум, нягледзячы на найвышэйшую канкурэнцыю! Пастараюся стаць лепшым і дамагчыся стабільнасці,* — дадаў Чапелін.

Адзначым, што Уладзімір упершыню ў сваёй кар'еры падняўся на п'едэстал гонару Кубка свету. А прадстаўнікі мужчынскай зборнай Беларусі не былі на п'едэстале Кубка свету з далёкага 2005 года. Цяпер наша мужчынская зборная па біятлоне ўваходзіць у дзясятку лепшых у заліку Кубка нацый.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■

■ Будзь у курсе!

# У снежні купляем з выгадай

**Акцыі «Дзень зніжак» на нехарчовыя тавары пройдуць у гандлёвых арганізацыях Мінска ў снежні, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

Змяншэнне цэн у «ЦУМе» 10, 17, 24 снежня складзе 17 працэнтаў, ва ўнівермагу «Беларусь» 6, 13, 20, 23, 24, 27 снежня — 20 працэнтаў, у «ГУМе» 8, 22 снежня — таксама 20 працэнтаў. Гандлёвы дом «На Нямізе», пачынаючы з 27 снежня, кожную сераду, суботу і нядзелю будзе рэалізоўваць нехарчовыя тавары са зніжкай 20 працэнтаў. У «Кірмашы» — 7, 14, 21, 28 снежня. У «Старт-Х» 15-працэнтная зніжка — 7, 14, 21, 28 снежня. У «Паўночнікы» — 8, 14, 22, 29 снежня на асобныя групы прамысловых тавараў такая ж зніжка, у «1000 дробязяў» — 8, 15, 22, 29 снежня, у «Крышталі» — 7, 14, 21, 28 снежня. «Гаспадар і Гаспадыня» 14, 21 снежня прапануюць зніжку 20 працэнтаў. Крамы ГЦ «Сталіца» 9, 10, 24, 25 абяцаюць зніжкі ад 5 да 50 працэнтаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Сталічны час

# За смеццеправод прыйдзецца даплаціць?

### У Мінску прапануюць увесці дыферэнцыраваныя тарыфы на вываз адходаў

**Пра гэта ішла гаворка на пасяджэнні рабочай групы па пытанні ўтрымання і добраўпарадкавання тэрыторыі сталіцы, паведамляе БЕЛТА. Прадугледжваецца, што жыхары дамоў, у якіх няма смеццеправода, змогуць сэканоміць: кошт вывазу цвёрдых камунальных адходаў для іх будзе меншым. Навоўвядзенне заклікана стымуляваць мінчан адмовіцца ад гэтай састарэлай тэхнічнай прылады.**

Спрэчнае пытанне выносіцца на абмеркаванне падчас праведзення планавых сходаў з жыхарамі або шляхам пакватэрнага апытання. Каб пазбавіцца ад смеццеправода, а ў будучыні, магчыма, і сэканоміць на вывазе смецця, неабходна згода больш чым 50% уласнікаў і наймальнікаў. Акрамя таго, у двары дома павінна быць уладкавана пляцоўка з кантэйнерамі. Яе наяўнасць і стан правяраюць работнікі жыллёвых службаў.

Сёлета ад смеццеправодаў ужо адмовіліся ў 385 сталічных дамах, яшчэ ў 50 аб'ектах зараз праводзяцца работы. Не будзе згортвацца ініцыятыва і ў наступным годзе. Прапанову аб увядзенні дыферэнцыраваных тарыфаў на вываз смецця падтрымала Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, цяпер дакументы знаходзяцца на разглядзе ў Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■


## НОВОПОЛЬСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**Пуховичского района Минской области проводит повторный открытый аукцион по продаже земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома гражданам Республики Беларусь, расположенного на территории сельсовета**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **д. Культура, ул. Усходняя, 624484004601000049** | 0,1500 | Сети электроснабжения, возможность газификации | 1525,07 | 5 620 | 1 124 |

Задаток перечисляется на р/с № 360062511003 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в 222810, г. М. Горка, ул. Ленинская, 27, БИК 153001795, УНН 600177772, ОКПО 04429639, код платежа 04901, Новопольский сельисполком.

Порядок проведения аукциона оговорен в Положении о его проведении.

Аукцион состоится **16 декабря 2016 года в 15.00** по адресу: аг. Новополье, ул. Центральная, 21 (здание исполкома) Пуховичского района Минской области.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **12 декабря 2016 года до 17.00** по вышеуказанному адресу.

Телефоны для справок: **(8-017-13) 3-03-16, 3-03-35.**

Сайт Пуховичского райисполкома: **www.pukhovichi/minsk-region.by**

■ Спажывец

## ЧЫМ ПАРАДУЕ ПЕРАДСВЯТОЧНЫ ГАНДАЛЬ?

**Кандытарскімі фабрыкамі, якія ўваходзяць у канцэрн «Белдзяржхарчпрам», запланавана вырабіць і паставіць на ўнутраны рынак каля двух мільёнаў штук навагодніх падарункаў.**

Яны расфасаваны ў баулы розных формаў і памераў вагой ад 300 грамаў да 3 кілаграмаў. Рознічныя цэны ў залежнасці ад фасоўкі цяпер складаюць: ад 4 рублёў за 300 грамаў да 45 рублёў за тры кілаграмы.

Да канца года, па інфармацыі Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, на ўнутраны рынак будзе пастаўлена 310 тысяч дал шампанскага і пеністых вінаў. Цяпер рознічныя цэны на шампанскае і пеністыя віны вытворчасці Мінскага завода пеністых вінаў складаюць ад 4,99 да 12,09 рубля, Мінскага завода вінаградных вінаў — ад 4,55 да 5,29 рубля.

У перыяд з 20 па 31 снежня ва ўсіх рэгіёнах краіны пачнуць работу каля 1080 ёлачных кірмашоў (з іх каля 200 — у Мінску). У продажы будуць прадстаўлены натуральныя елкі і сосны вышынёй ад аднаго да трох метраў, а таксама навагоднія елкі ў кантэйнерах (кадках), навагоднія букеты з галінак хвойных дрэў. Рознічныя цэны на натуральныя елкі і сосны ў залежнасці ад рэгіёна паставак складуць: да метра — 7—15 рублёў, ад метра да двух — 9—20 рублёў, ад двух да трох метраў — 10—23 рублі, у кантэйнерах (кадках) — 20—100 рублёў.

Арыенціровачны кошт пераднавагодніх мерапрыемстваў па краіне складае ад 30 рублёў на чалавека і вышэй (уключаючы святочнае меню і забаўляльную праграму), а ў навагоднюю ноч — ад 70 рублёў на чалавека і вышэй.

У перыяд калядных і навагодніх свят у цэлым па краіне запланавана правесці каля 1040 кірмашоў (з іх 55 — у Мінску) і 17 180 мерапрыемстваў, скіраваных на стымуляванне попыту: выстаў-продажаў, акцый па зніжэнні цаны тавару, рэкламных акцый з дэгустацыяй харчовых тавараў і г.д.

## Кілаграмы і літры,

### ці Колькі ўзважана ў грамах і мілілітрах

**Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю з 1 студзеня 2017 года будзе рэкамендаваць гандлёвым аб'ектам пазначаць цану харчовых прадуктаў за адзін кілаграм і адзін літр.**

З названай даты суб'ектам, якія ажыццяўляюць гандаль харчовымі прадуктамі, вага якіх не роўная аднаму кілаграму (літру), пры ўказанні інфармацыі аб цане харчовых прадуктаў за адзінку тавару будзе рэкамендавана дадаткова, акрамя кошту за адзінку, паказваць кошт за 100 грамаў (мілілітраў), адзін кілаграм (літр). Для харчовых прадуктаў, намінальная вага якіх не перавышае 250 грамаў (мілілітраў), трэба будзе паказваць кошт адзінкі тавару за 100 грамаў (мілілітраў), для астатніх — за адзін кілаграм (літр). З 1 ліпеня 2017 года гэту норму плануецца зрабіць абавязковай.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# БАНК ПРАВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У прыватнасці, НЦПІ адказвае за працэс апрацоўкі прававых актаў ад моманту іх прыняцця (выдання) да афіцыйнага апублікавання на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь і ўключэння ў дзяржаўныя інфармацыйна-прававыя рэсурсы. Таму адна з найважнейшых функцый арганізацыі — афіцыйнае апублікаванне нарматыўных прававых актаў і вядзенне Нацыянальнага рэестра прававых актаў Рэспублікі Беларусь. Дарэчы, штодня ў Нацыянальным рэестры рэгіструецца каля 70 прававых актаў, зараз іх ужо больш за 190 тысяч.

Таксама НЦПІ займаецца вядзеннем асноўнага дзяржаўнага інфармацыйна-прававога рэсурса — эталоннага банка даных прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Ён уяўляе сабой поўны сістэматызаваны збор актуалізаванага заканадаўства ў электронным выглядзе — амаль 200 тысяч прававых актаў і міжнародных тамоў на сёння. Збор прававых актаў, іх апрацоўка, сістэматызацыя і абнаўленне ажыццяўляюцца з дапамогай сучасная і ўнікальнай у сваім родзе тэхналогіі.

***— У 2016 годзе адбыліся пэўныя змены ў прававым рэгуляванні сферы распаўсюджвання прававой інфармацыі, Прэзідэнт падпісаў адпаведны ўказ. Якія перадумовы прывялі да гэтага і што дакладна змянілася?***

— Пачнём з таго, што паколькі НЦПІ забяспечвае вядзенне эталоннага банка даных, афіцыйнае апублікаванне, то менавіта ён адказвае за якасць прававой інфармацыі на сваіх рэсурсах і адпаведнасць яе арыгіналу. Натуральна, што Нацыянальны цэнтр таксама заклапочаны, каб усе іншыя распаўсюджвальнікі прававой інфармацыі, якімі з'яўляюцца і даведачна-інфармацыйныя сістэмы па заканадаўстве, і выдаўцы спецыяльнай літаратуры на прававую тэматыку, і ўладальнікі тэматычных інтэрнэт-сайтаў, падавалі яе ў належным стане і выглядзе, бо крыніцай і эталонам такой прававой інфармацыі з'яўляюцца менавіта рэсурсы НЦПІ.

Таму згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 ліпеня 2016 г. №261 і адбыліся змены ў парадку распаўсюджвання прававой інфармацыі і сістэме дзяржаўных прававых рэсурсаў. Калі канкрэтна, дакумент удакладніў кола суб'ектаў, якія абавязаны заключаць дамову з НЦПІ для прадстаўлення прававой інфармацыі.

Адначасова пашыраны спіс выпадкаў, у якіх допускаецца ажыццяўленне дзейнасці па распаўсюджванні і падачы прававой інфармацыі без заключэння дамовы з НЦПІ. Напрыклад, арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі могуць не заключаць дагавор, калі размяшчаюць на сваіх сайтах не больш за пяць прававых актаў, якія датычаць іх уласнай дзейнасці.

Акрамя таго, НЦПІ належыць функцыя кантролю за выкананнем патрабаванняў заканадаўства ў галіне распаўсюджвання (прадстаўлення) прававой інфармацыі. Таму аналізуецца не толькі прававая інфармацыя, якую суб'екты распаўсюджваюць згодна з дамовай, але ўвогуле даследуюцца факты распаўсюджвання прававой інфармацыі, каб своечасова выявіць парушэнне заканадаўства.

Дарэчы, паводле судовай практыкі, у шэрагу выпадкаў распаўсюджванне прававой інфармацыі без дазволу Нацыянальнага цэнтра кампетэнтныя органы кваліфікуюць як незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць, што можа прывесці да штрафу з канфіскацыяй даходу, атрыманага ў выніку такой дзейнасці, сродкаў здзяйснення адміністрацыйнага правапарушэння.

Таксама Указ №261 вызначае, што дзяржаўныя органы і арганізацыі павінны выкарыстоўваць інфармацыйна-прававыя рэсурсы НЦПІ (спіс якіх таксама ўдакладнены ва Указе №261) не толькі падчас нарматворчасці, але і ў дзейнасці па ажыццяўленні адміністрацыйных працэдур.

***— Акрамя ўласна сістэматызацыі прававой інфармацыі Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі забяспечвае дзейнасць разнастайных рэсурсаў, у тым ліку ў інтэрнэце. Якія з іх больш арыентаваны на прафесійную юрыдычную супольнасць, а якія — на грамадзян, не звязаных са сферай права?***

— Магу сказаць, што ўсе яны адрасаваны шырокаму колу карыстальнікаў. Мы нават у слогане арганізацыі зазначылі, што робім прававую інфармацыю даступнай для ўсіх.

Безумоўна, пераважная колькасць наведвальнікаў рэсурсаў НЦПІ ў інтэрнэце — прафесійныя юрысты, эканамісты і г.д. — усе, хто па прычыне сваёй прафесійнай прыналежнасці павінен сачыць за зменамі ў заканадаўстве, навінамі прававой сферы ў краіне і за яе межамі. Напрыклад, Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал pravo.by — перш за ўсё адзіная крыніца афіцыйнага апублікавання прававых актаў краіны. Але таксама гэта інфармацыйны рэсурс, які акумулюе юрыдычныя навіны, друкуе артыкулы і рэпартажы ўласных карэспандэнтаў, змяшчае праекты законаў, навукова-практычную і даведачную інфармацыю.

Ці возьмем Прававы форум Беларусі (forumpravo.by) — гэта не толькі рэсурс, дзе грамадзяне могуць задаць свае пытанні юрыстам з ліку ўдзельнікаў форума, але таксама гэта інтэрактыўная пляцоўка для дыскусій наконт дзеючага заканадаўства і практыкі яго выкарыстання, узяць удзел у якіх могуць не толькі юрысты. Пашыраецца значэнне форума і ў якасці пляцоўкі для афіцыйнага публічнага абмеркавання найбольш уплывовых праектаў нарматыўных прававых актаў.

Узгаданы рэсурсы, такім чынам, цікавыя не толькі юрыстам і эканамістам. Партал, напрыклад, штомесяц наведвае 280 тысяч чалавек, форум — 36 тысяч. Да таго ж, акрамя дарослай аўдыторыі, нам ёсць што прапанаваць і дзецям. Дзіцячы прававы сайт (mir.pravo.by) — унікальны рэсурс, арыентаваны на малодшую аўдыторыю, а таксама бацькоў, выкладчыкаў і выхавальнікаў.

Вядома ж, шэраг рэсурсаў НЦПІ мае накіраванасць менавіта на юрыстаў-прафесіяналаў. Напрыклад, арганізацыя забяспечвае фарміраванне і падтрыманне ў актуальным стане банкаў даных: праектаў законаў Рэспублікі Беларусь, правапрымяняльнай практыкі (сёння налічвае больш за 12 000 дакументаў), судовай практыкі (больш за 26 700 дакументаў), формаў дакументаў, тэхнічных нарматыўных прававых актаў, лакальных прававых актаў дзяржаўных органаў і іншых арганізацый (больш за 200 банкаў даных), тэматычных банкаў даных (у тым ліку створаны сёлета банк даных «Спартыўнае права»).

А інфармацыйна-пошукавыя сістэмы «ЭТАЛОН» і «ЭТАЛОН-ONLINE» створаны, каб забяспечваць юрыстам аператыўны доступ да актуальнага і афіцыйнага заканадаўства. Таксама разам з Беларускім дзяржаўным інстытутам стандартызацыі і сертыфікацыі ў гэтым годзе мы стварылі адзіную інфармацыйную платформу «ЭТАЛОН-Стандарт», якая забяспечвае доступ да нарматыўных прававых актаў і тэхнічнай «нарматыўкі».

Самі бачыце: ёсць што прапанаваць і вузкім спецыялістам, і проста неабыякавым да заканадаўства асобам. Важна, што мы намагаемся не пакідаць нашу аўдыторыю сам-насам з усім гэтым сапраўды морам прававой інфармацыі, якую генеруе НЦПІ. Таму ідзём за сваёй аўдыторыяй у сацсеткі: даведацца пра навіны заканадаўства могуць карыстальнікі амаль усіх папулярных у нашай краіне сацыяльных сетак, а нядаўна мы нават стварылі публічны чат у Viber. Сучасны чалавек павінен мець магчымасць атрымаць гарантавана якасную прававую інфармацыю праз любы са зручных для яго каналаў.

Прынамсі, інтэрнэт-тэхналогіі сёння дазваляюць не толькі пастаўляць гатовую інфармацыю спажыўцам, але таксама пэўным чынам выхоўваць сваю аўдыторыю, спрыяць прафесійнаму станаўленню маладога пакалення юрыстаў. Што я маю на ўвазе: напрыклад, пераважная доля падпісчыкаў старонкі Нацыянальнага прававога Інтэрнэт-партала ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» — моладзь ва ўзросце 18—27 гадоў. Гэта значыць, што нас чытаюць студэнты, выпускнікі, маладыя юрысты — самая актыўная і мабільная частка прафесійнай супольнасці. І мы здольныя дапамагчы ім вырасці ў сапраўдных прафесіяналаў.

***— Аднак IT-прастора — адна з самых дынамічных і хутка развіваецца. Каб заставацца ў трэндзе, трэба ўвесь час змяняцца разам са зменлівымі тэндэнцыямі. Якую перспектыву бачыць Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі ў гэтым напрамку?***

— Знаходзячыся, можна сказаць, на вастрыі прававой інфарматызацыі краіны, мы добра ўсведамляем хуткаплыннасць і зменлівасць тэхналагічнай прасторы і робім пэўныя захады, каб адпавядаць сучасным патрабаванням. У гэтым годзе дапрацавалі інфармацыйна-пошукавую сістэму «ЭТАЛОН» версіі 6.7 — палепшылі алгарытмы пошуку.

Таксама ў супрацоўніцтве з Беларускім дзяржаўным універсітэтам у інфармацыйна-пошукавых сістэмах «ЭТАЛОН» і «ЭТАЛОН-ONLINE» была значна пашырана лінгвістычная база для аўтаматычнага перакладу тэкстаў нарматыўных прававых актаў і іншых дакументаў з рускай на беларускую мову (і наадварот) — больш чым на 80 тысяч руска-беларускіх перакладаў слоў.

Планаў на будучыню шмат. Так, будзем мадэрнізаваць сістэму «ЭТАЛОН-ONLINE» і яе сайт пад адаптыўны дызайн, які будзе лёгка змяняцца пад любыя мабільныя прылады. Зараз вы можаце пабачыць такое на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале. Дарэчы, партал — першы з рэсурсаў дзяржаўных органаў, пераведзены на адаптыўны дызайн. Да таго ж значна спрасцілася структура партала. З гэтай нагоды сёлета ён быў адзначаны інтэрнэт-прэміяй «Tibo-2016» за першае месца ў намінацыі «Рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання».

Увогуле, у межах дзяржаўнай сістэмы прававой інфармацыі і надалей будзем удасканальваць механізмы і спосабы доступу да прававой інфармацыі ў электроннай форме праз інтэрнэт і воблачныя тэхналогіі.

***— Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі надае ўвагу і навуковай дзейнасці ў галіне прававой інфарматызацыі?***

— Так. Сёлета зацверджана Праграма развіцця навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці НЦПІ на 2016—2020 гады. У межах праграмы праводзяцца навуковыя даследаванні і распрацоўкі, накіраваныя на развіццё дзяржаўнай сістэмы прававой інфармацыі. У прыватнасці, у гэтым годзе здзейснена навукова-даследчая праца па мадэрнізацыі тэхналогіі фарміравання эталоннага банка даных прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь на падставе перспектыўных тэхналогій, якія існуюць у краіне, і з улікам пераходу на электронны дакументазварот.

Таксама НЦПІ — выдавец навукова-практычнага часопіса «Право.by», які распаўсюджваецца не толькі на паперы, але і ў pdf-версіі. Часопіс уключаны Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй у спіс навуковых выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па юрыдычных спецыяльнасцях. Навуковыя публікацыі часопіса індэксуюцца ў міжнароднай навукаметрычнай базе даных «Расійскі індэкс навуковага цытавання», які мае больш за мільён зарэгістраваных карыстальнікаў.

Акрамя таго, НЦПІ не першы год праводзіць адукацыйныя семінары для юрыстаў па пытаннях практыкі выкарыстання нормаў беларускага заканадаўства.

***— І апошняе пытанне, але па важнасці — не з апошніх: раскажыце, калі ласка, крыху падрабязней пра перспектывы развіцця дзяржаўнай сістэмы прававой інфармацыі.***

— Сёння дзяржаўная сістэма прававой інфармацыі дазваляе забяспечваць укараненне нацыянальнага прававога масіву ў сусветную інфармацыйную прастору. Дзяржаўныя інфармацыйна-прававыя рэсурсы накіраваны на самыя розныя ўзроставыя і мэтавыя групы і цалкам забяспечваюць інфармацыйныя патрэбы суб'ектаў гаспадарання і грамадзян у прававой інфармацыі.

На бліжэйшую перспектыву плануем і далей працаваць над пашырэннем зместу дзяржаўных інфармацыйна-прававых рэсурсаў і іх функцыяналу, стварэннем банкаў даных лакальных прававых актаў, прынятых дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі.

Паралельна будзе працягвацца ўкараненне электроннага дакументаабароту ў працэс фарміравання прававых інфармацыйных рэсурсаў.

Адзін з перспектыўных напрамкаў — шырокае выкарыстанне нарматворчымі органамі аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы, якая забяспечвае фарміраванне Нацыянальнага рэестра прававых актаў Рэспублікі Беларусь. Яна дазваляе аптымізаваць і аўтаматызаваць правядзенне абавязковай юрыдычнай экспертызы нарматыўных прававых актаў, рэгістрацыю гэтых актаў у Нацыянальным рэестры, афіцыйнае апублікаванне на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

Сістэмай ад пачатку года ўжо карыстаюцца мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, галоўныя ўпраўленні юстыцыі аблвыканкамаў і сам Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі. У выніку значна скараціліся тэрміны афіцыйнага апублікавання нарматыўных прававых актаў гэтых органаў. Праз аўтаматызаваную сістэму ў Нацыянальным рэестры ўжо зарэгістравана больш за 4700 нарматыўных прававых актаў.

На будучыню плануем, што згаданая аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма пакладзе пачатак комплекснай аўтаматызацыі нарматворчай дзейнасці дзяржаўных органаў, будзе садзейнічаць аптымізацыі працэсу фарміравання адзінай інфармацыйна-прававой прасторы і дазволіць узняць на новы ўзровень нарматворчасць у краіне. Напрыклад, у перспектыве праз сістэму будуць праходзіць нарматыўныя прававыя акты не толькі рэспубліканскага ўзроўню, а таксама здзяйсняцца падрыхтоўка праектаў нарматыўных прававых актаў.

Таксама ў межах дзяржаўнай сістэмы прававой інфармацыі працягнецца пашырэнне кола суб'ектаў, якія забяспечваюцца афіцыйнай прававой інфармацыяй: міжнародных арганізацый і інтэграцыйных аб'яднанняў, членам або ўдзельнікам якіх з'яўляецца Рэспубліка Беларусь, замежных дзяржаў, а таксама іх органаў.

Важным напрамкам застаецца забеспячэнне судоў, органаў пракуратуры, адвакатуры, натарыяту, іншых арганізацый і грамадзян актуальнай і праўдзівай інфармацыяй пра судовую і правапрымяняльную практыку.

Напрыканцы хачу скарыстаць магчымасць і звярнуцца да калег. З нагоды прафесійнага свята зычу вам, паважаныя юрысты, плённай працы на карысць Беларусі, новых прафесійных дасягненняў, свабоднай думкі і новых цікавых ідэй. Будзем разам спрыяць развіццю беларускага заканадаўства!

**Гутарыла Ганна ШЫЛЕЦ.**

■ Чалавек — чалавеку

# ПА-РАНЕЙШАМУ Ў СТРАІ...



**Не так даўно лёс звёў мяне з урачом, які ўпершыню ў нашай краіне зрабіў адкрытую аперацыю на сэрцы. Было гэта ў Крупках, дзе ў далёкім 1962 годзе Мікалай Мікалаевіч ШЧАЦІНІН працаваў хірургам, намеснікам галоўнага ўрача раённай бальніцы.**

Неяк па восені туды прывезлі дзевяцікласніка з агнястрэльным раненнем. Трэба было тэрмінова вырашаць, што рабіць, як ратаваць...

У той час студэнтаў медыцынскага інстытута вучылі: дакранешся да сэрца — станеш забойцам, тым больш — ва ўмовах раённай бальніцы... А да ўсяго родныя падлетка сказалі няпраўду: быццам ён сам і выпадкова стрэліў у сябе. Толькі праз шмат гадоў высветлілася, што ў юнака стралялі... На той жа момант вельмі важна было ведаць напрамак кулі ў сэрцы, яе размяшчэнне...

На нарадзе калегі выказвалі розныя меркаванні. Адны папярэджвалі: «Не бярыся, бо дабром гэта не скончыцца», іншыя (іх была большасць) падтрымалі рашэнне Мікалая Мікалаевіча дзейнічаць. Аб гэтым жа на каленях маліла маці падлетка...

Скончылася ўсё добра: сын застаўся жыць. Хірург за высокае прафесійнае майстэрства быў узнагароджаны Ганаровай граматай Мінскага абласнога аддзела аховы здароўя і абкама прафсаюзаў медыцынскіх работнікаў. Да таго ж выдатна праведзеная аперацыя адкрыла Мікалаю Мікалаевічу дарогу ў аспірантуру: ён паступіў на кафедру агульнай хірургіі Мінскага медыцынскага інстытута. Разам з калегамі займаўся рэканструкцыйнай і аднаўленчай хірургіяй. У 1966 годзе разам з супрацоўнікамі рыхтаваў і ўдзельнічаў у IV Усесаюзнай канферэнцыі, прысвечанай перасадцы органаў і тканак. На форуме выступіў з навуковай работай «Прафесійныя аспекты хірургічнай дэанталогіі», праводзіў аперацыі, планавыя кансультацыі, аўтар больш як 80 навуковых работ.

Цяпер Мікалай Мікалаевіч працуе ангіяхірургам у Мінскім кансультацыйна-дыягнастычным цэнтры, праводзіць кансультацыі для ўрачоў — хірургаў і неўролагаў паліклінік сталіцы па захворваннях вен і артэрый, вядзе прыём. Цудоўна выглядае: адкрыты, заўсёды з гумарам і ўсмешкай. У вольны час, як прызнаецца, захапляецца літаратурай, асабіста ведаў Уладзіміра Караткевіча.

...Нядаўна Мікалай Мікалаевіч адзначыў 80-гадовы юбілей, і праз любімую «Звязду» я хачу пажадаць шаноўнаму доктару здароўя, актыўнага даўгалецця і плённай працы!

**Вікторыя АЛЯКСАНДРАВА,**
*г. Мінск.*

# «УСПОМНІМ МЫ — УСПОМНЯЦЬ НАС»

**...Калі ёсць такая магчымасць, хоць раз на тыдзень ды стараюся прайсці па сваёй роднай вуліцы, паглядзець на будынак школы.**

Страшна ўспомніць, але парог яе я пераступіў у 1954 годзе! Даўно, здавалася б, але і сёння помню сваіх аднакласнікаў, сваіх настаўнікаў. Адзін з іх, Уладзімір Ігнатавіч Ляпёшкін, выкладаў у нас родную мову і літаратуру, усім, каго цікавіла прыгожае пісьменства, чытаў вершы — у тым ліку свае. Трэба сказаць, што быў ён не аматарам, а сапраўдным паэтам — аўтарам многіх зборнікаў. Дагэтуль у памяці яго радкі пра сяброў, пра людзей свайго пакалення:

*Ніхто з нас не муціў вады,*
*Ніхто не заслужыў дакору,*
*І за пражытыя гады*
*Нам ані крапелькі не сорам.*

Гэта сапраўды так: наш Уладзімір Ігнатавіч быў потым дырэктарам сталічных школ №2 і 23, Заслужаным настаўнікам БССР, узначальваў выдавецтва «Народная асвета».

У памяці яшчэ і тое, што гэты чалавек за свае ўласныя грошы паставіў помнік аднавяскоўцам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

...Пакуль жывём, нельга, па-мойму, забываць пра тых, каго болей няма. Як той казаў, успомнім мы — успомняць, магчыма, і нас?

**Уладзімір ГОЛУБЕЎ,**
*г. Мінск*

■ Дакрананне

# Любоў без лішніх слоў

**Як дастукацца да дзіцячых сэрцаў? Як зрабіць жыццё сельскіх школьнікаў больш яскравым, паўнацэнным, змястоўным? Над гэтым мы працуем даўно, адкрываючы новыя формы баўлення вольнага часу. Гэты год таксама стаў адметным: у нас з'явілася школьнае лясніцтва.**



Фота Наталлі ЮШКЕВІЧ.

Але спачатку адміністрацыя Навагрудскага лясгаса прапанавала нам правесці экскурсію па тэрыторыі іх гаспадаркі. Ахвотных набралася больш за 20 чалавек, хоць надвор'е не зусім спрыяла. Адразу дзеці трапілі ў гадавальнік, дзе ўбачылі зусім маленькія, кволыя елачкі, якія толькі-толькі набіралі моц — так бы мовіць, дрэўцы «ясельнай групы». «Хацелася дакрануцца да гэтай прыгажосці, хацелася дапамагчы ім вырасці!» — казала адна з удзельніц экскурсіі.

Затым мы перайшлі ў зону маладой пасадкі, дзе дрэўцы пакрысе набіралі моц, дзе галінкі самых жвавых елачак з зайздросным імпэтам імкнуліся ўвысь.

Ну а далей...

Далей нас сустрэў «вялікаўзроставы» ельнік, дзе побач з веліччу дарослых дрэў хацелася проста памаўчаць.

Здавалася б, а што тут такога? Звычайная паездка ў звычайны лясгас, у яловы лес... Але ж і нам, дарослым, і нашым дзецям так часта не хапае менавіта звычайнага, чалавечага. Дзеці паназіралі за ростам дрэў — ад нараджэння да сталасці. Яны, спадзяюся, зразумелі, якой важнай справай займаюцца людзі, што працуюць у лясгасе.

Цяпер мы з падвоеным жаданнем будзем удзельнічаць у акцыях «Наш лес» па добраўпарадкаванні лясных насаджэнняў і «Пасадзі дрэва», цяпер у нас з'явіцца яшчэ больш кармушак і шпакоўняў... І няхай нашы мерапрыемствы камусьці здадуцца простымі і немудрагелістымі — менавіта яны без лішніх слоў кранаюць дзіцячыя душы.

**Аксана ЗАСАДЗІНСКАЯ,**
**намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Пятрэвіцкага дзіцячага сада-сярэдняй школы Навагрудскага раёна**

■ Добрая навіна

# ЯШЧЭ НА АДЗІН ХРАМ БОЛЬШ!

**Днямі ў нашым мястэчку адбылася вялікая падзея — адкрылася новая царква Свяціцеля Мікалая Цудатворца.**

Асвяціў храм і новыя званы Уладыка Антоній, епіскап Слуцкі і Салігорскі. У набажэнстве прымала ўдзел духавенства з Капыльскага і Салігорскага благачыння, а таксама з Мінска.

Уладыка Антоній падзякаваў усім прыхаджанам за вялікую працу, якую яны ўклалі ў будаўніцтва новага храма, і асобным з іх уручыў узнагароды. У прыватнасці, настаяцель прыхода Міхаіл Мардвінаў удастоены медаля Кірылы Тураўскага, а матушка і рэгент хору Алена Мардвінава атрымала медаль Святога князя Уладзіміра.



Пасля набажэнства Уладыка Антоній наведаў музей Кузьмы Чорнага. Экскурсія ў ім завяршылася невялікай пастаноўкай на рэлігійную тэму, узятую з кнігі «Дзецям пра праваслаўную веру».

**Людміла НІЖЭВІЧ,**
**жыхарка аграгарадка Цімкавічы,**
*Капыльскі раён*

■ Сітуацыя

# Не толькі настальгія

## Быць ці не быць 200-гадоваму юбілею школы?

**Сваё 145-годдзе хутка адзначыць наша Машчонская школа, якая 80 гадоў таму стала сярэдняй. А вось ці будуць у яе іншыя юбілеі і круглыя даты, пакуль пытанне.**

Цяпер у гэтай школе вучыцца больш за 70 дзяцей. Прыкладна столькі ж застанецца ў найбліжэйшыя гады. Школа паспяхова прайшла акрэдытацыю, вучні з году ў год становяцца пераможцамі раённых алімпіяд і спартыўных спаборніцтваў, на роўных з гарадскімі аднагодкамі здаюць экзамены пры паступленні ў навучальныя ўстановы. І тым не менш над школай навісла пагроза закрыцця. Вучняў збіраюцца вазіць за восем кіламетраў у аграгарадок Ходцы.

Цяпер там, у дзіцячым садку — базавай школе, вучыцца крыху больш за 50 вучняў. Школьнікі з навакольных вёсак, як некалі іх бацькі, ужо не першы год ходзяць у нашу, Машчонскую, бо Ходцаўская не мела і не мае статусу сярэдняй. І гэта невыпадкова — Машчонская школа і тады, і цяпер геаграфічна размешчана так, што вакол яе канцэнтруецца найбольшая вёскі рэгіёна. Таму яе і абралі асноўнай.

— Калі закрыюць нашу школу, — лічыць яе **дырэктар Віктар Паўлавіч КУЧЫНСКІ**, — то для сапраўднага адраджэння аграгарадка Белая Ліпа перспектыў будзе значна менш.

Згодны з ім і бацькі вучняў, былыя выпускнікі, якія з горыччу абмяркоўваюць такую невясёлую перспектыву на сайце «Аднакласнікі», дзе існуе група «Машчонская школа — шлях да ведаў». Яна аб'ядноўвае шмат землякоў, раскіданых па розных кутках нашай краіны і былога Савецкага Саюза.

Дарэчы, для іх родная школа не толькі настальгічны ўспамін, але і месца пастаянных сустрэч аднакласнікаў, якія не бачылі адзін аднаго дзясяткі гадоў. Яны ўдзячны калектыву педагогаў, якія памятаюць пра іх і прымаюць гэтак жа гасцінна, як у далёкім дзяцінстве. Са свайго боку і выпускнікі па магчымасці імкнуцца дапамагаць роднай школе. Вядома ж, з надзеяй, што яна будзе жыць яшчэ доўгія гады.

...На адной з нядаўніх сустрэч прысутнічалі вучні, якія скончылі яе 50 і больш гадоў таму. Хацелася б спадзявацца, што і цяперашнія вучні будуць мець магчымасць сабрацца ў школе на яе 200-гадовым юбілеі. Што цалкам магчыма, калі, прымаючы рашэнне аб скарачэнні колькасці ўстаноў адукацыі, адказныя асобы ўлічаць не толькі эканамічны бок праблемы, але і многае іншае.

**Аляксандр ПІСКУНОЎ, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, выпускнік,**
*Сенненскі раён*

WWW.ZVIAZDA.BY ZVAROT@ZVIAZDA.BY WWW.ZVIAZDA.BY ZVAROT@ZVIAZDA.BY WWW.ZVIAZDA.BY ZVAROT@ZVIAZDA.BY WWW.ZVIAZDA.BY

■ Зачапіла

Рэверс з сеціва

## Н. ЗІГУЛЯ. «Горад на скрыжаванні дарог і эпох» *(«Звязда» ад 26 лістапада)*

— Вельмі добра, што газета адсочвае выкананне дзяржпраграмы ў райцэнтрах вобласці. А ўлічваючы, што такі агляд робіцца пры дапамозе Магілёўскага аблвыканкама, хочацца параіць, каб выканкамы іншых абласцей бралі такі вопыт на ўзбраенне. Бо часта атрымліваецца, што закон існуе, а на справе нічога не робіцца. Тут бачна, што работа, можа, і не такімі вялікімі тэмпамі, але ж вядзецца. Вельмі карысным для мяне стала і знаёмства з нейкімі адметнымі асаблівасцямі гарадоў раённага падпарадкавання. Па невялічкіх замалёўках можна ў цэлым уявіць жыццё канкрэтнага населенага пункта. Лічу праект газеты вельмі пазнавальным, і не толькі для інвестараў. Так трымаць! А яшчэ абавязкова з'езджу ў Крычаў на Пацёмкінскія забавы. Цікава паглядзець на тое месца, дзе гуляла сама імператрыца.

**Іван Закаблукаў,** *Віцебская вобласць.*

## С. БАРЫСЕНКА. «Што адбірае ў нашых мужчын 10 гадоў жыцця?» *(«Звязда» ад 30 лістапада)*

— Знаёмы ўрач-уролаг расказаў неяк пра аднаго пацыента... Было таму глыбока за семдзесят пяць. Прыйшоў на прыём ды моліць: «Дайце што-небудзь... можа, сэрца і не вытрымае, але ж хачу яшчэ хоць раз у раі з жанчынай пабываць, пакуль не памёр...» А тут высвятляецца, што ў нас ужо ў пяцьдзясят палова мужчын для гэтага не зусім прыдатныя. І ні ўролаг, ні віягра ім не патрэбныя. Можна было б іх пашкадаваць, але ж з якога перапалоху? Самі сябе даводзяць, штодня робяць усё магчымае, каб не затрымацца на гэтым свеце. Ды і наогул! Азірнейцеся навокал: колькі недагледжаных, непрыбраных, пацёртых, безгустоўных... Мужчыны сучасныя нават ад карыесу сябе абараніць не могуць, што ўжо казаць пра іншыя выпрабаванні... Што ж рабіць нам, жанчынам, якія жадаюць жыць доўга ды... якасна? Мы ж у пяцьдзясят яшчэ... ого-го! Цукеркі! А тут...

**Святлана,** *г. Мінск.*

## С. ЯСКЕВІЧ. «У сабакі вочы пазычыўшы» *(«Звязда» ад 1 снежня)*

— Прачытала і горка пасмяялася: гэта ж трэба, якія ў людзей праблемы бываюць — сабаку ўкралі за дзве тысячы долараў. Тут думаеш, як да зарплаты дацягнуць, а потым, атрымаўшы яе, заплаціць за камунальныя паслугі, аддаць частку дзецям-студэнтам і сядзець далей, нават не дазваляючы сабе марыць пра новае паліто ці боты.

А калі сур'ёзна, я на месцы супрацоўнікаў міліцыі прапажу не шукала б. Калі ў грамадзянкі ёсць грошы на такія жывыя цацкі, то няхай бы яна наймала прыватнага дэтэктыва шукаць тое, што згубіла па дурноце. А міліцэйскія сілы лепш бы задзейнічаць на іншае. Ну, напрыклад, з наступленнем зімы горш становіцца нашым адзінокім старым у вёсках. Дзеці радзей прыязджаюць, а зладзеі, гатовыя пажывіцца дармовым, не дрэмлюць. Ды і ў гарадзе хапае такіх людзей, якім патрэбная абарона ад злых сваякоў, ад прайдзісветаў, што выдаюць сябе за сацыяльных і медыцынскіх работнікаў. Такія злыдні ўбачаць, што тут часта бываюць людзі ў форме, то лішні раз падумаюць, ці варта рызыкаваць.

**Марыя С,** *г. Кобрын.*

## Н. НІКАЛАЕВА. «Пакаленне «гугл» *(«Звязда» ад 27 лістапада)*

— Вы пішаце: «Сучасная адукацыя будуецца не вакол фігуры настаўніка, а вакол фігуры вучня. Педагог перастаў быць адзінай крыніцай інфармацыі ў класе, а вучні больш не з'яўляюцца пасіўнымі слухачамі. У гэтай сітуацыі патрабуецца ўменне не толькі яе здабыць, але і асэнсаваць, і крытычна ацаніць. Атрымліваючы новую порцыю інфармацыі, вучні павінны навучыцца разглядаць яе з розных пазіцый, рабіць высновы адносна яе дакладнасці і каштоўнасці».

Я не магу пагадзіцца з гэтым сюжэтам. Пачнем з канца. Справа ў тым, што вучань здольны яе (інфармацыю) не толькі здабыць, але і асэнсаваць, і крытычна ацаніць , калі валодае крытэрыямі адпаведнай ацэнкі. А гэтыя крытэрыі ён можа набыць толькі ў працэсе засваення пэўных тэарэтычных ведаў. Але наша Міністэрства адукацыі ўзяло курс на вывучэнне тэорыі з навучальнага працэсу, гэта па-першае. Па-другое, нельга бачыць у педагогу толькі сродак прадстаўлення і перадачы інфармацыі. Яго роля — у пераўтварэнні інфармацыі ў веды вучняў (у зразумелую ім інфармацыю), бо самастойна вучням справіцца з гэтай задачай вой як цяжка! Па-трэцяе, інфармацыю трэба разглядаць не з «розных пазіцый», а ў святле засведчаных (як гэта робіцца ў добрых падручніках), праўдзівых пазіцый. А ўвогуле, я з задавальненнем чытаю вашы матэрыялы. Але асцярожней на паваротах!

**Прафесар Уладзімір Бяркоў,**
**Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 420/С-38954 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – материальный склад № 2), площадью 778,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Фабричная, д. 6, корп. 14 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 423650100007000977, (назначение – обслуживание производственной территории), площадью 3,8803, расположенный по адресу: г. Лида, ул. Фабричная, д. 6. На земельном участке расположены иные объекты, не подлежащие реализации. Земельный участок является неделимым |
| **Обременения со стороны 3-х лиц** | - капитальное строение является обеспечением исполнения обязательства по кредитному договору с ОАО «Белинвестбанк» (залог);<br>- Министерством юстиции Республики Беларусь установлено ограничение на осуществление государственной регистрации сделок (снятие ограничений возможно при наличии информации об участнике-победителе аукциона) |
| **Начальная цена продажи** | 174 000 р. (сто семьдесят четыре тысячи рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 17 400 р. (семнадцать тысяч четыреста рублей) |
| **ЛОТ 2** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 420/С-1731 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – столовая закрытого типа), площадью 3618,3 кв.м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Фабричная, д. 8а |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 423650100007000977, (назначение – обслуживание производственной территории), площадью 3,8803, расположенный по адресу: г. Лида, ул. Фабричная, д. 6. На земельном участке расположены иные объекты, не подлежащие реализации. Земельный участок является неделимым. |
| **Обременения со стороны 3-х лиц** | - капитальное строение является обеспечением исполнения обязательства по кредитному договору с ЗАО «Банк «ВТБ» (залог);<br>- Министерством юстиции Республики Беларусь установлено ограничение на осуществление государственной регистрации сделок (снятие ограничений возможно при наличии информации об участнике-победителе аукциона) |
| **Начальная цена продажи** | 1 197 600 р. (один миллион сто девяносто семь тысяч шестьсот рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 119 760 р. (сто девятнадцать тысяч семьсот шестьдесят рублей) |
| **Продавец** | ОАО «Лидская обувная фабрика», 231300, г. Лида, ул. Фабричная, 6, тел./факс 8-0154-52-16-61 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | 100% предоплата в течение 20 календарных дней с момента снятия всех ограничений и заключения договора купли-продажи |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 11 января 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Лида, ул. Фабричная, 6**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 05 января 2017 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

---

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА С ПОНИЖЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ**

***Предыдущее извещение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» от 27.10.2016***

# ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ»

## проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»**

| | |
|---|---|
| **ЛОТ №1** | Капитальное строение с инв. №500/С-38080 по адресу: г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, 62. Площадь – 163,4 кв.м. Наименование – магазин «Альмагор». Назначение – Здание специализированное розничной торговли. Земельный участок с кадастровым номером 500000000005000418, пл. 19,9465 га, предоставленным продавцу на праве долевого постоянного пользования (Доля: 1773/2500), с установленными ограничениями: Санитарно-защитные полосы водоводов, площадь 2,5940 га; Охранная зона магистральных трубопроводов, площадь 1,6738 га; Объект недвижимости обременен договорами аренды. Доля в праве постоянного пользования, относящаяся к капитальному строению после регистрации перехода прав собственности, – 3/2500. Условия дальнейшего использования объекта – в соответствии с регламентом генерального плана г. Минска |
| **Начальная цена (в т.ч. НДС 20%), BYN** | **209 544 руб. 00 коп.** |
| **Задаток, BYN** | **20 954 руб. 40 коп.** |
| **Шаг аукциона** | 5% |
| **Сведения об организаторе торгов, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» 220029, г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 25. тел. 8 017 286 78 59, факс 8 017 286 76 80 |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» 220029, г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 25. тел. 8 017 286 78 59, факс 8 017 286 76 80 |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка и лота производится **резидентами** в белорусских рублях на следующие **банковские реквизиты:** р/с 3012000790020 в ОАО «Банк БелВЭБ», код 226 г. Минск, пр-т Победителей, 29. Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». УНН 101059240, ОКПО 37392696. Оплата задатка и лота производится **не резидентами** в белорусских рублях или в доларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты на следующие **банковские реквизиты:** Сч./Асс.: 3012000790020 (**BYN)**; Сч./Асс.: 3012000790003 **(USD)** SWIFT CODE: BELBBY2X ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, пр-т Победителей, 29, БИК: 153001226. Банк корреспондент CITIBANK N.A., NEW YORK SWIFT CODE: CITIUS33 Acc.36249772; Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 12 декабря 2016 г.** в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 312 |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **16 декабря 2016 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, зал совещаний ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» |

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»

**Дополнительная информация по тел.: +375 17 284 94 32; +375 25 684 22 55, +375 29 684 22 55. E-mail: yakovenko@horizont.bn.by**

---

Департамент
по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
**ЗАВЕРЕНО**
29.11.2016
С.А.Сушко

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## ОБ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ЧЕТВЕРТОГО ВЫПУСКА

### Иностранного общества с ограниченной ответственностью «Зомекс Инвестмент»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента:

на белорусском языке: полное – Замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Зомекс Інвестмент»; сокращенное – ЗТАА «Зомекс Інвестмент»;

на русском языке: полное – Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Зомекс Инвестмент» (далее – эмитент); сокращенное – ИООО «Зомекс Инвестмент».

2. Место нахождения эмитента: Республика Беларусь, 220114, г. Минск, ул. Петра Мстиславца, д. 4, помещение 165, комната 2; телефон: 8 (017) 2693260, факс: 8 (017) 2693250.

3. Эмитент зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом 9 сентября 2008 г. Регистрационный номер – 191061449.

4. Уставный фонд эмитента составляет 600 000 долларов США.

5. Основные виды деятельности эмитента:

сдача внаем собственного и арендуемого недвижимого имущества;

управление недвижимым имуществом.

6. Депозитарием эмитента является депозитарий открытого акционерного общества «БПС-Сбербанк» (далее – ОАО «БПС-Сбербанк») (зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 28 декабря 1991 г., регистрационный № 25; действует на основании специального разрешения (лицензии) Министерства финансов Республики Беларусь на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-1246-1086, выданного 8 декабря 1993 г., срок действия не ограничен; место нахождения: 220005, Республика Беларусь, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6).

7. Эмитент в соответствии с законодательством Республики Беларусь раскрывает информацию на рынке ценных бумаг путем размещения на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг (далее – Единый информационный ресурс), публикации в печатных средствах массовой информации (в газете «Звязда») и (или) доводит до сведения неопределенного круга лиц иным образом, определенным республиканским органом государственного управления, осуществляющим государственное регулирование рынка ценных бумаг (далее – Регистрирующий орган).

Информация об изменениях и/или дополнениях, внесенных в Проспект эмиссии жилищных облигаций четвертого выпуска эмитента (далее – Проспект эмиссии), размещается эмитентом на Едином информационном ресурсе, а также публикуется в газете «Звязда» не позднее 7 дней после их регистрации в Регистрирующем органе.

Эмитент в соответствии с законодательством Республики Беларусь раскрывает годовой отчет (бухгалтерскую отчетность) в срок не позднее одного месяца после его утверждения в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь о хозяйственных обществах, путем;

размещения на Едином информационном ресурсе;

опубликования в газете «Звязда» либо размещения на сайте эмитента (www.bir.by).

Эмитент раскрывает информацию о своей реорганизации или ликвидации, а также о реорганизации дочерних и зависимых Хозяйственных обществ эмитента (при их наличии), в соответствии с законодательством Республики Беларусь, в том числе путем ее размещения на Едином информационном ресурсе не позднее двух рабочих дней:

в случае ликвидации – с даты принятия соответствующего решения общим собранием участников эмитента;

в случае реорганизации – с даты принятия соответствующего решения общим собранием участников эмитента, а также с даты государственной регистрации организации, созданной в результате реорганизации; даты внесения в Единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей записи о прекращений деятельности присоединенной организации.

Кроме того, в случае принятия эмитентом решения о ликвидации (прекращении деятельности), сведения о том, что эмитент находится в процессе ликвидации (прекращения деятельности), подлежат размещению в глобальной компьютерной сети Интернет на официальном сайте юридического научно-практического журнала «Юстиция Беларуси» (www.justbel.info) в порядке и сроки, определенные законодательством Республики Беларусь.

Эмитент раскрывает информацию о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем:

ее размещения на Едином информационном ресурсе не позднее двух рабочих дней с даты получения эмитентом копии заявления в экономический суд о банкротстве эмитента;

публикации в журнале «Судебный вестник Плюс: Экономическое правосудие» в течение 5-и календарных дней с момента получения соответствующего судебного постановления.

Эмитент раскрывает в соответствии с законодательством Республики Беларусь иную информацию о существенных фактах (событиях, действиях), касающихся его финансово-хозяйственной деятельности, которые могут повлиять на стоимость Облигаций, в порядке и сроки, установленные законодательством Республики Беларусь.

8. Общее собрание участников эмитента приняло решение о четвертом выпуске жилищных облигаций 25 октября 2016 г., протокол № 25-10/2016.

9. Эмитент является заказчиком объекта жилищного строительства: «Многофункциональный комплекс на пересечении пр. Независимости – ул. Макаенка в г. Минске». 3-я очередь строительства. Жилой дом 5в по г/п. (Без генплана и наружных сетей) (далее – Жилой дом).

Заключение государственной экспертизы (положительное) архитектурного проекта Жилого дома от 6 января 2016 г. № 1137-15/15И (в дополнение к заключению государственной экспертизы от 8 мая 2014 г. № 375-15/14) подготовлено Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза».

Права эмитента на земельный участок, необходимый для обеспечения строительства Жилого дома, удостоверены свидетельством (удостоверением) от 19 июня 2015 г. № 500/1473-3660, кадастровый номер 500000000009005735.

Нормативный срок продолжительности строительства Жилого дома: 27 месяцев, в том числе подготовительный период – 1 месяц. Предполагаемая дата приемки в эксплуатацию Жилого дома – 1 ноября 2018 г.

10. Облигации четвертого выпуска – жилищные, именные, конвертируемые эмиссионные ценные бумаги в бездокументарной форме, имеющие равную номинальную стоимость и сроки осуществления прав в рамках настоящего выпуска вне зависимости от времени приобретения облигации (далее – облигации).

Объем выпуска облигаций – 4 620 000 белорусских рублей.

Количество облигаций – 7000 штук.

Облигация имеет номинальную стоимость 660 белорусских рублей и эквивалент этой стоимости, выраженный в квадратных метрах общей площади жилого помещения в Жилом доме, равный 1 квадратному метру. Указанный эквивалент номинальной стоимости остается неизменным.

Доход по облигациям не начисляется и не выплачивается.

11. Выпуск облигаций зарегистрирован Регистрирующим органом 29 ноября 2016 г.

Государственный регистрационный номер: 5-200-02-2832.

12. Исполнение обязательств эмитента по облигациям обеспечено поручительством Общества с ограниченной ответственностью «Дана Астра» (далее – поручитель) (220114, г. Минск, ул. Петра Мстиславца, д. 5, пом. 207, к. 2, УНП 191295361) на сумму 4 620 000 белорусских рублей, в пределах которой поручитель отвечает перед владельцами 7000 облигаций в случае неисполнения или ненадлежащего исполнения эмитентом своих обязательств по облигациям.

13. Размещение облигаций осуществляется на неорганизованном рынке эмитентом самостоятельно, а также с использованием услуг ОАО «БПС-Сбербанк», Унитарного предприятия по оказанию услуг на рынке ценных бумаг «АСБ БРОКЕР» (далее – УП «АСБ БРОКЕР») путем открытой продажи юридическим и (или) физическим лицам – резидентам и (или) нерезидентам Республики Беларусь (далее – покупатели облигаций).

Дата начала размещения облигаций: 25 ноября 2016 г.

Дата окончания размещения облигаций: 3 мая 2019 г., если иная дата не будет определена Общим собранием участников эмитента в порядке и в сроки, установленные законодательством Республики Беларусь о ценных бумагах.

Отношения сторон оформляются:

договором с эмитентом, предусматривающим обязательства эмитента по строительству жилых помещений в Жилом доме владельцу облигаций, а также иные существенные условия в соответствии с законодательством Республики Беларусь, который заключается по месту нахождения эмитента, указанному в пункте 2 настоящего документа;

договором купли-продажи облигаций, который заключается в пунктах продажи облигаций.

Пункты продажи облигаций (их место нахождения и регламент работы):

по месту нахождения эмитента: ежедневно с 9.00 до 19.00 (включая выходные дни, государственные праздники и праздничные дни);

в центральном аппарате ОАО «БПС-Сбербанк» по адресу: г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6, ежедневно, за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь, (далее - нерабочие дни), с 9.00 до 15.00;

в структурных подразделениях ОАО «БПС-Сбербанк», указанных на официальном интернет-сайте банка (www.bps-sberbank.by), ежедневно, за исключением нерабочих дней, с учетом регламента работы соответствующего структурного подразделения банка;

в Унитарном предприятии «АСБ БРОКЕР» по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 201, ежедневно, за исключением нерабочих дней, с 9.00 до 16.00.

Открытая продажа облигаций осуществляется по договорной цене, определяемой эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг.

Средства при проведении открытой продажи облигаций уплачиваются в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, в безналичной форме, в белорусских рублях, на расчетный счет № 3012107342010 в ОАО «БПС-Сбербанк» (Республика Беларусь, 220005, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6, БИК 153001369, УНП 100219673).

14. Срок обращения облигаций – 920 календарных дней (с 25 ноября 2016 г. по 3 июня 2019 г.).

15. Дата начала погашения облигаций – 3 июня 2019 г.

Для целей погашения облигаций депозитарий эмитента формирует реестр владельцев облигаций на 27 мая 2019 г. В случае если указанная дата выпадает на нерабочий день, формирование реестра осуществляется в последний рабочий день, предшествующий нерабочему дню.

Владелец облигаций при погашении (досрочном погашении) облигаций имеет право получить номинальную стоимость облигации либо жилое помещение в Жилом доме, общая площадь которых соответствует эквиваленту номинальной стоимости, выраженному в квадратных метрах, принадлежащих ему облигаций.

16. В случае запрещения эмиссии облигаций, признания Регистрирующим органом четвертого выпуска жилищных облигаций недействительным эмитент возвращает владельцам облигаций средства, полученные в оплату размещенных облигаций в месячный срок с даты признания выпуска недействительным, и письменно уведомляет Регистрирующий орган о возврате указанных средств владельцам облигаций в полном объеме.

17. Ознакомиться с Проспектом эмиссии (изменениями в Проспект эмиссии – при наличии) можно в пунктах продажи облигаций, указанных в пункте 13 настоящего документа, а также на сайте эмитента (www.bir.by).

Заместитель директора
Иностранного общества
с ограниченной ответственностью
«Зомекс Инвестмент» Д. Никич

Главный бухгалтер
Иностранного общества
с ограниченной ответственностью
«Зомекс Инвестмент» Л.Л.Клочко

# РАБОТЫ ЯШЧЭ ШМАТ

## Дзяржава абяцае адсутнасць бар'ераў і магчымасці для самарэалізацыі

**У нашай краіне на сёння налічваецца 554,4 тысячы людзей з інваліднасцю, у тым ліку 29,5 тысячы дзяцей-інвалідаў. Гэта 5,8% ад усяго насельніцтва. Як жывецца гэтым людзям, што робіць дзяржава для таго, каб інтэграваць іх у грамадства?**

### Правы інвалідаў — пад кантролем

Як вядома, у 2015 годзе Беларусь падпісала Канвенцыю аб правах інвалідаў. І хоць гэты дакумент не прыўносіць ніводнага новага або дадатковага права для такіх людзей, ён мяняе само ўяўленне аб інваліднасці, якая ўжо не лічыцца выключна медыцынскай праблемай, і засяроджвае ўвагу на інтэграцыі інвалідаў у жыццё грамадства. Гэтай восенню прыняты праект закона аб ратыфікацыі Канвенцыі, накіраваны ў Савет Рэспублікі.

— Ратыфікацыя Канвенцыі ўскладае на краіну пэўныя абавязацельствы па забеспячэнні цэлага комплексу правоў і свабод людзей з інваліднасцю. Механізмам рэалізацыі гэтага дакумента з'яўляецца Нацыянальны план — ён уяўляе сабой сукупнасць прававых і арганізацыйна-практычных мер па забеспячэнні правоў інвалідаў, — сказаў журналістам **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК.** — Будзе таксама створаны механізм кантролю за рэалізацыяй правоў інвалідаў. Гэтыя функцыі стане выконваць Рэспубліканскі міжведамасны савет па праблемах інвалідаў (цяпер яго ўзначальвае намеснік прэм'ер-міністра Наталля Качанава). Савет будзе каардынаваць работу ўсіх зацікаўленых дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый.

**Любы чалавек зможа зайсці ў інтэрнэт і ўбачыць, якія аб'екты ўжо цалкам даступныя для інвалідаў і якія плануецца зрабіць даступнымі ў найбліжэйшай будучыні.**

Дарэчы, мяркуецца, што Нацыянальны план па рэалізацыі нормаў Канвенцыі аб правах інвалідаў будзе распрацаваны ўжо ў гэтым месяцы. Распрацоўвае яго НДІ працы Мінпрацы і сацабароны.

### Асаблівая ўвага — праву на працу

Адным з самых важных кірункаў работы органаў сацыяльнай абароны Аляксандр Румак назваў садзейнічанне ў працаўладкаванні людзям з інваліднасцю. Усяго ў Беларусі на сёння працуюць 84 тысячы інвалідаў. «Многія людзі з інваліднасцю імкнуцца да таго, каб зарабляць сабе і сваім сем'ям на жыццё. Нацыянальнае заканадаўства ўтрымлівае шэраг стымулюючых мер, якія падтрымліваюць імкненне чалавека з інваліднасцю рэалізаваць сябе прафесійна — для тых, хто гэтага хоча», — падкрэсліває намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны.

Сярод такіх мер можна адзначыць бронь для працаўладкавання інвалідаў, што ўстанаўліваецца штогод мясцовымі органамі ўлады наймальнікам. Так, сёлета былі забраніраваны працоўныя месцы для 2081 інваліда, за кошт броні за дзесяць месяцаў атрымаў работу 461 чалавек. За студзень — верасень гэтага года таксама былі заключаны дагаворы з 9 наймальнікамі на кампенсацыю і фінансаванне выдаткаў са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва за набытае абсталяванне для стварэння 24 рабочых месцаў для інвалідаў.

Дзяржаўная служба занятасці падтрымлівае прадпрымальніцкую ініцыятыву людзей з абмежаванымі магчымасцямі. 15 з іх атрымалі сёлета субсідыі на адкрыццё ўласнай справы. Усяго за дзесяць месяцаў бягучага года служба занятасці Беларусі аказала садзейнічанне ў працаўладкаванні 1656 інвалідам, на прафесійнае навучанне было накіравана 256 чалавек.

**ДАРЭЧЫ**

**✓ Узровень першаснай інваліднасці ў Беларусі зніжаецца. За 9 месяцаў гэтага года ён знізіўся на 2,1%, у тым ліку працаздольнага насельніцтва — на 3,6%. Разам з тым узровень дзіцячай інваліднасці вырас на 5,7%.**

**✓ Працоўныя пенсіі ў Беларусі атрымліваюць каля 473,5 тысячы інвалідаў, сацыяльныя — 55,3 тысячы, у тым ліку 28,4 тысячы дзяцей-інвалідаў. Сярэдні памер пенсіі па інваліднасці складае 259,90 рублёў.**

Механізмы прафесійнай рэабілітацыі і працаўладкавання інвалідаў пастаянна ўдасканальваюцца. Так, раней у індывідуальнай праграме рэабілітацыі ўказваўся канкрэтны пералік прафесій (спецыяльнасцяў), па якіх яны могуць працаваць. Гэта звужала магчымасці чалавека з інваліднасцю працаваць, таму было прынята рашэнне адмяніць гэты пункт і паказваць у індывідуальнай праграме рэабілітацыі толькі віды дзейнасці, якія ён не можа выконваць у сілу фізічных абмежаванняў. На ўсе астатнія работы чалавек зможа прэтэндаваць. Па словах Аляксандра Румака, эксперымент, праведзены ў Мінску, паказаў правільнасць такога падыходу. Цяпер прынята рашэнне аб распаўсюджванні гэтай практыкі на ўсю краіну.

### Калі безбар'ернае асяроддзе не прайшло выпрабаванняў, дом не будзе прыняты

Мы ставім перад сабой задачу забяспечыць безбар'ернае асяроддзе па ўсім шляху руху чалавека з інваліднасцю, — заявіў на прэс-канферэнцыі Аляксандр Румак. Пры гэтым ён адзначае, што справа не абмяжоўваецца толькі пандусамі, і прызнае, што «работы яшчэ шмат».

Цяпер прапануецца ўзмацніць адказнасць праекціроўшчыкаў і забудоўшчыкаў за невыкананне патрабаванняў па забеспячэнні безбар'ернага асяроддзя. У прыватнасці, урад ўдасканаліў парадак і ўмовы прымання ў эксплуатацыю шматкватэрных жылых дамоў, а таксама метады кантролю якасці будаўніча-мантажных работ. Уведзены дадатковы крытэрый ацэнкі якасці аб'екта — стварэнне безбар'ернага асяроддзя. А таксама норма, якая прадпісвае абавязковае правядзенне выпрабаванняў і кантрольных вымярэнняў аб'ектаў безбар'ернага асяроддзя і абавязвае забудоўшчыка і заказчыка няўхільна выконваць патрабаванні тэхнічных нарматыўных прававых актаў.

**Прынята рашэнне адмяніць гэты пункт і паказваць у індывідуальнай праграме рэабілітацыі толькі віды дзейнасці, якія ён не можа выконваць у сілу фізічных абмежаванняў. На ўсе астатнія работы чалавек зможа прэтэндаваць.**

Кантроль і нагляд у галіне будаўнічай дзейнасці ўскладзены на органы дзяржаўнага будаўнічага нагляду. «Мы ставім задачу канкрэтызаваць адказнасць за парушэнні патрабаванняў безбар'ернага асяроддзя на ўсіх этапах, каб і заказчык, і падрадчык іх няўхільна выконвалі», — падкрэсліває Аляксандр Румак.

Таксама ў гарадах будуць фарміравацца інтэрактыўныя карты даступнасці аб'ектаў для інвалідаў. Любы чалавек зможа зайсці ў інтэрнэт і ўбачыць, якія аб'екты ўжо цалкам даступныя для інвалідаў і якія плануецца зрабіць даступнымі ў найбліжэйшай будучыні.

**Святлана БУСЬКО.**

*busko@zviazda.by*

# ЗаПРАГРАМАваць на жыццё

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Максім страціў слых у самым маленстве. Вучыўся ў спецшколе. Расказвае, што яго знаёмыя з парушэннямі слыху працуюць па розных спецыяльнасцях: дызайнер, кухар, стаматолаг, настаўнік, акцёр.

— Але ў прэстыжных прафесіях насамрэч занята вельмі мала глухіх. Многія кампаніі не хочуць траціць свой час на іх, для кіраўніцтва гэта проста нязручная сітуацыя. Як правіла, нас арыентуюць на работу на заводзе. Я сваім прыкладам хачу паказаць, што магчымы іншы варыянт. Мы можам рэалізаваць самыя смелыя мары, — дзеліцца хлопец.

Ён навучаўся ў звычайнай групе па 3D-мадэляванні ў IT-школе. Перакладчыка не было — выкладчыкі вырашылі: тое, што яны тлумачаць для астатніх наведнікаў вусна, будуць дубляваць на дошцы спецыяльна для Максіма. Цяпер сумесна з гэтай школай хлопец збіраецца арганізаваць IT-курсы для глухіх. Заняткі будуць праходзіць і ў аўдыторыях, і анлайн. Ужо распрацавана спецыяльная навучальная праграма па 3D-мадэляванні на дзевяць месяцаў, весці якую стане сам Максім. Пазней плануюць дадаць заняткі па фатаграфіі, вэб-дызайне і іншых спецыяльнасцях.

Выпускнікоў курсаў, якія захочуць працаваць па атрыманай спецыяльнасці, забяспечаць заказамі. У праект хочуць прыцягнуць IT-кампаніі, якія б аплачвалі навучанне маладых людзей і потым бралі іх на работу, вочна ці дыстанцыйна.

Па падліках арганізатараў, для запуску такой школы патрэбна пяць тысяч рублёў. Гэтыя сродкі пойдуць на стварэнне відэаўрокаў па праграмаванні, мантаж адзнятага матэрыялу ў выглядзе заняткаў, дапрацоўку сэрвісу для анлайн-адукацыі глухіх.

— Мы абышлі пяць школ для дзяцей з парушэннямі слыху і прапанавалі атрымаць новую спецыяльнасць, — кажа **кіраўнік IT-школы «Myfreedom» Алена ДЗІНМАН.** — Не ўсе вераць, што гэта магчыма. Але гэта ўсяго толькі справа часу.

### АНЛАЙН-ШКОЛА «У САВЫ»

Барысаўчаніна **Аляксандра МАКАРЧУКА** называюць беларускім Стывенам Хокінгам. Мужчына амаль цалкам паралізаваны, але гэта не перашкаджае яму станавіцца найлепшым на спаборніцтвах па сістэмным адміністраванні і працаваць на высокааплатных месцах.



Анлайн-школа Аляксандра МАКАРЧУКА (у цэнтры) разлічана на інвалідаў і іх апекуноў.

Калі сем гадоў таму рукі і ногі Аляксандра перасталі рухацца, ён вырашыў, што не хоча, каб інваліднасць зрабіла яго бездапаможным. За два тыдні ён асвоіў галасавое кіраванне камп'ютарам.

**Калі абслугоўваў камп'ютары, людзі нават не заўважалі, што я інвалід. Я хутка спраўляўся з работай.**

— Звычайна, каб навучыцца ім карыстацца, патрэбна пара месяцаў. Але мне тады дзяўчына спадабалася, хацеў з ёй кантактаваць праз інтэрнэт, таму так хутка і асвоіў, — усміхаецца мужчына. — Дый я з дзевяці гадоў з камп'ютарам на «ты».

З 2010 года барысаўчанін пачаў працаваць аддалена. На пошук работы ў яго пайшло каля месяца. Кожную раніцу Аляксандр прачынаўся і праглядаў сайты з вакансіямі, рассылаў свае рэзюмэ. Тое, што ён інвалід, ад патэнцыйных наймальнікаў не хаваў. І змог уладкавацца. Спачатку быў аператарам відэаназірання, потым знайшоў вакансію сістэмнага адміністратара.

— Калі абслугоўваў камп'ютары, людзі нават не заўважалі, што я інвалід. Я хутка спраўляўся з работай, — расказвае суразмоўнік.

Цяпер Аляксандр дыстанцыйна давучваецца ў Міжрэгіянальным адкрытым сацыяльным інстытуце Расіі і працуе IT-рэкруцёрам у мінскай кампаніі. Прызнаецца, што прафесія яму даўно падабалася і ён марыў гэтым займацца.

Для такіх жа людзей, як ён, мужчына вырашыў стварыць анлайн-школу «У Савы», дзе будуць курсы рознай тэматыкі — ад праграмавання да асабістага росту. Унікальнасць праекта ў тым, што выкладаць там будуць людзі з інваліднасцю. Аляксандр ужо сабраў каманду з 15 настаўнікаў.

— Мэтавая аўдыторыя курсаў — гэта таксама апекуны. Паколькі яны пастаянна знаходзяцца дома і дапамагаюць інвалідам, я лічу важным удзяліць ім увагу, — заўважае мужчына.

Грошы на анлайн-школу Аляксандру ўдалося сабраць з дапамогай часопіса «Имена». Наступны крок — сертыфікаваць выкладчыкаў. Калі барысаўчаніну ўдасца атрымаць прыз на конкурсе сацыяльных праектаў, то ён патраціць грошы менавіта на гэтыя мэты.

— Мая школа дазволіць інвалідам рэалізаваць сябе прафесійна і асабіста, атрымаць большую самастойнасць і незалежнасць (і знізіць нагрузку на апекуноў і асістэнтаў), адшукаць новых сяброў, — разважае Аляксандр Макарчук. — Людзі з асаблівасцямі ў развіцці хочуць быць карыснымі грамадству, і ім сапраўды ёсць чым падзяліцца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Па заклiку сэрца

# ВАЛАНЦЁРСКІЯ ЦЭНТРЫ — У КОЖНУЮ ВНУ

### З такой ідэяй выступіла Міністэрства адукацыі нашай краіны

**«Валанцёрскі рух сярод студэнтаў дастаткова развіты. І, напэўна, будзе правільным, калі на працягу наступнага навучальнага года валанцёрскія цэнтры з'явяцца ў кожнай вышэйшай навучальнай установе, — падкрэсліваe начальнік Упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Наталля ПШАНІЧНАЯ. — Асабліва актуальная гэта ідэя для медыцынскіх і педагагічных навучальных устаноў, студэнты якіх ужо актыўна дапамагаюць на добраахвотніцкіх пачатках у медыцынскіх, сацыяльных установах і установах адукацыі. Да таго ж стварэнне такіх цэнтраў не патрабуе дадатковых фінансавых выплат, асобнага памяшкання, кадравых і юрыдычных службаў...»**

Прэс-сакратар МНС Віталь Навіцкі расказаў, што дапамога насельніцтву ў ліквідацыі наступстваў і папярэджанні надзвычайных і небяспечных сітуацый таксама адбываецца з прыцягненнем валанцёраў: «Для таго каб падрыхтаваць чалавека, здольнага аказваць дапамогу ў надзвычайных сітуацыях, мы прыкладаем пэўныя намаганні: вучым, экіпіруем, застрахоўваем... Цяпер у межах праекта «Валанцёр МНС» у нас зарэгістраваліся і пакінулі свае кантактныя звесткі 500 чалавек, гатовых дапамагаць. Адзіная праблема — валанцёры чакаюць штуршка, канкрэтных указанняў ад кіраўніцтва. А хацелася б, каб у будучыні нашы памочнікі праяўлялі большую актыўнасць...»

Вялікую ролю ў дапамозе тым, хто мае патрэбу, адыгрываюць прадстаўнікі Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа. Колькасць яго ўдзельнікаў налічвае сёння больш як 20 тысяч чалавек, прычым 70 працэнтаў з іх складаюць маладыя людзі. Як адзначае намеснік генеральнага сакратара таварыства Іна Лемяшэўская, для валанцёрскай дзейнасці важнае значэнне мае прыцягненне людзей усіх узростаў, бо калі моладзь актыўна адгукаецца на нейкія актуальныя, тэрміновыя акцыі, то сталыя валанцёры могуць узяць на сябе, напрыклад, дапамогу шматдзетным або нядобранадзейным сем'ям, догляд за пажылымі людзьмі. Гэта цяжкая штодзённая праца, якая патрабуе досведу...

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

■ З глядзельнай залы

# ТЭАТРАЛЬНАЯ ЭКЗІСТЭНЦЫЯ,

## альбо Як патрапіць пад «раздачу»?

**Пакуль Нацыянальную тэатральную прэмію цяжка назваць традыцыйнай для беларускай культурнай сферы: яе прысуджаюць чацвёрты раз. Фестываль яшчэ не мае свайё канчатковай устойлівай формы, працягвае пошукі аптымальнага фармату работ над ацэнкай тэатральнага мастацтва краіны. Шэраг змен, што датычацца арганізацыі конкурсу, сёлета выклікалі абмеркаванні і спрэчкі. І гэта сведчыць пра жывы інтарэс да тэатра ў Беларусі. Можа быць зараз мы на шляху да ісціны, якая, вядома, нараджаецца праз спрэчкі. Толькі так тэатральная грамадскасць здолее знайсці найлепшае рашэнне і наблізіцца да адпаведнай формы правядзення фестывалю.**

Адлегласць паміж імпрэзамі Нацыянальнай тэатральнай прэміі расцягнулася на два гады. Заяўкі на ўдзел у конкурсе падавалі тэатры з пастаноўкамі, створанымі паміж 2014 і 2016 гадамі. Тут арганізатары маюць рацыю: каб быў больш выбар і канкурэнцыя спрыяла павышэнню агульнага ўзроўню спектакляў, якія маглі б станавіцца сапраўднымі мастацкімі з'явамі ў тэатральным жыцці. Але і кожны тэатр, што ўзяў удзел у фестывалі, атрымаў «час для манеўраў», бо ўзрасла магчымасць выбару найлепшых спектакляў з уласнага рэпертуару.

Змены адбыліся і ў арганізацыі работы журы. Калі ў першыя гады правядзення прэміі яно складалася са 112 членаў Тэатральнай акадэміі, якія супольна прымалі рашэнні па кожнай катэгорыі, то сёлета праца ішла па чатырох асобных напрамках. Акрамя таго, «судзіць» канкурсантаў накіроўваюцца ў журы не толькі тэатральныя дзеячы, але і іншыя прадстаўнікі культурнай сферы Беларусі. Арганізатары змянілі і форму галасавання (дзеля максімальна аб'ектыўных адзнак, як тлумачыцца). Раней праходзіла адкрытае абмеркаванне ўдзельнікаў конкурсу, а зараз кожны з членаў журы ставіў адзнакі без агучвання свайго меркавання для астатніх: каб старшыня журы ды найбольш уплывовыя тэатральныя крытыкі і дзеячы не маглі змяніць пункт гледжання калег. Ці прывяло азначанае наватарства да паляпшэння сістэмы ацэнак конкурсных спектакляў? Адназначна сказаць можна толькі тое, што павялічыла колькасць узнагароджаных пастановак. Цяпер «найлепшых» спектакляў і ўзнагароджаных асоб значна болей, чым у папярэднія гады. Але калі імавернасць атрымаць жаданага бусла (статуэтка прэміі) значна павялічваецца, то ці не прывядзе гэта да зніжэння градуса канкурэнтнай барацьбы, тым больш, што ў некаторых намінацыях яна і так фактычна адсутнічае?

Але самы спрэчны момант прэміі тычыўся непасрэдна намінацый. Скасаваныя намінацыі «Найлепшая рэжысёрская работа» і «Найлепшая праца мастака-пастаноўшчыка» выклікалі непаразуменні яшчэ да пачатку асноўнай работы над фарміраваннем конкурснай праграмы. Як было зазначана напярэдадні тыдня выніковых паказаў, гэтае рашэнне абмяркоўвалася Міністэрствам культуры разам з дырэкцыямі беларускіх тэатраў. Асобныя намінацыі за працу рэжысёра і мастака-пастаноўшчыка нібыта замянілі вылучаць «Найлепшы спектакль», бо калі спектакль — «найлепшы», то праца рэжысёра, сцэнографа і нават драматурга там таксама павінна быць найлепшая. І ўсё, здаецца, добра і аргументавана, але... Нават падчас абвяшчэння пераможцаў у Купалаўскім тэатры адчувалася: нешта не тое. Дарэчы, самі лаўрэаты ўзнагарод паспрабавалі выправіць сітуацыю. Ва ўдзячных прамовах са сцэны гучалі прозвішчы і рэжысёраў, і сцэнографаў, і харэографаў, і кампазітараў — усіх, хто быў задзейнічаны ў стварэнні агульнага вобраза спектакля.

Тэатральны свет складаецца з асоб, і постаць рэжысёра ў ім, бадай, самая заўважная — ад яго залежыць усё, што ўбачыць гледачы на сцэне (хоць сам рэжысёр па-за ёю). І менавіта падчас такіх мерапрыемстваў, як Нацыянальная тэатральная прэмія, масавы глядач знаёміцца са значнымі імёнамі беларускага тэатра. Хіба ж можна хаваць іх за назвай найлепшага спектакля, асабліва калі ўлічваць неабходнасць культурнага выхавання беларусаў? Але эксперымент на тое і эксперымент, каб на практыцы зразумець, што можна зрабіць яшчэ лепш. Напрыклад, спроба аб'яднаць ўзнагароды за найлепшую жаночую і найлепшую мужчынскую ролі ў адну намінацыю за «найлепшую акцёрскую работу» сябе не апраўдала. Гэтым разам арганізатары ўлічылі вынікі III Нацыянальнай прэміі і вярнулі гендарны падзел для акцёраў.

Здаецца, не хапіла і асобнай ацэнкі для тых, хто толькі пачынае свой шлях на тэатральнай глебе. Калі азірнуцца на тую ж літаратуру, у нашай краіне звяртаюць шмат увагі на дэбюты, падтрымліваюць маладых творцаў. Чым горшы тэатр?

Аднак Нацыянальная прэмія 2016 года стала нагодай паглыбіцца ў тэатральны працэс у Беларусі. Наяўнасць у конкурснай праграме не толькі сталічных, але і абласных тэатраў дазволіла найбольш поўна ацаніць узровень беларускага драматычнага майстэрства, прасачыць тэндэнцыі яго развіцця ў маштабе краіны. Вынікі даволі прадказальныя: большасць узнагарод дасталася мінскім тэатрам. Гэта нядзіўна: напрыклад, у намінацыях кшталту «Найлепшы спектакль оперы» ды «Найлепшы спектакль балета» былі прадказальныя перамогі Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета. Пытанні, што засталіся ў гледача ды цырымоніі абвяшчэння пераможцаў (які з вылучаных спектакляў Вялікага тэатра атрымае прыз? якія яго артысты стануць лаўрэатамі прэміі гэтым разам?), хутка знайшлі адказы. Прадказальнай была і катэгорыя музычнага тэатра. Да выніковага тыдня дайшлі толькі два спектаклі. Абодва — з Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра...


Аляксей ДУДАРАЎ атрымаў узнагароду за ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва.
Фота БЕЛТА.

У той час як у конкурсе драматычных тэатраў, наадварот, была вялікая канкурэнцыя. Калі глядзець на вынікі IV Нацыянальнай тэатральнай прэміі, цяжка паверыць, што падчас першага конкурсу самыя значныя ўзнагароды прысудзілі аднаму спектаклю («Не мой» Нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы). Сёлета статуэткі і, адпаведна, грашовую падтрымку атрымалі шмат тэатраў, як мінскіх, так і абласных. Здаецца, журы імкнулася нікога не пакрыўдзіць, адшукала станоўчыя бакі амаль ва ўсіх пастаноўках, але ў той жа час пазбавіла цырымонію інтрыгі.

«Найлепшы спектакль» — камедыя «Чайка» — у рэжысёрскай версіі Мікалая Пінігіна набыў апакаліптычнае гучанне. Прага Канстанціна Трэплева да новых ідэй на сутыкненні з усеагульным адчужэннем астатніх герояў дала грандыёзны выбух: у яго самагубстве (хто ведае?) водгулле чагосьці больш страшнага — маральнага і фізічнага канца свету... «Найлепшая мужчынская роля» адышла да акцёра Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра Івана Труса. У спектаклі «Крэйцарава саната» рэжысёра Саўлюса Варнаса яму ўдалося ўвасобіць увесь спектр духоўных змаганняў героя талстоўскай аповесці, прыцягнуць да сябе ўвагу гледача ад пачатку і да канца пастаноўкі, якая фактычна трымаецца на гэтай ролі. Прэмія за «найлепшую жаночую ролю» сёлета дасталася актрысе Марыне Дзянісавай, якая прадстаўляла Цэнтр эксперыментальнай рэжысуры БДАМ і Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў. Акцёрская работа ў спектаклі «Ілюзіі» падкрэслівалася мінімумам дэкарацый, маленькай залай і непарыўным аповедам пра гісторыю кахання ў чатырохкутніку з дзвюх сямейных пар. Праца артыстаў у такіх умовах адказная: любы фальш у выкананні мог разбурыць крохкую атмасферу шчырасці, на якой трымалася ўсё дзейства.


Фрагмент са спектакля «Маленькі прынц».

Нягледзячы на тое, што «Пінская шляхта» Палескага драматычнага тэатра не атрымала ўзнагароды па вылучаных намінацыях, сёлета ўсе зоркі сышліся для паказу менавіта гэтага спектакля. У 2016 годзе п'есе Дуніна-Марцінкевіча споўнілася 150 гадоў. Спалучэнне «Пінскай шляхты», пінскага тэатра і пінскага дыялекту (знакамітай палескай гаворкі) атрымалася аўтэнтычным і дадало фестывалю крыху народнага каларыту. Напэўна, менавіта гэты збег абставінаў паўплываў на рашэнне дырэкцыі Белтэлерадыёкампаніі: «Пінская шляхта» была адзначана спецыяльнай узнагародай і трапіць у эфір тэлеканала «Беларусь 3». Дарэчы, было б добра, калі б Белтэлерадыёкампанія захавала для гісторыі найлепшыя спектаклі, адзначаныя прэміяй, каб беларускія гледачы ў розных кутках краіны маглі пабачыць іншыя якасныя пастаноўкі. Тым больш, ёсць што паказаць.

Беларускі лялечны тэатр сёлета пацвердзіў свой высокі ўзровень. Рашэннем журы ўзнагародамі адзначаныя абодва спектаклі, паказаныя ў гэтай катэгорыі (прытым што ў тэатры лялек насамрэч за тэрмін ад папярэдняй прэміі з'явілася шмат адметных пастановак, на жаль, не ўсе з іх удзельнічалі). Пастаноўка «На дне» Магілёўскага абласнога тэатра лялек ніколькі не саступае ў мастацкай вартасці пераможцы — «ФРО» Брэсцкага тэатра лялек. Экзістэнцыяльная драма ўражвае сваёй экспрэсіяй, арганічным зліццём акцёра і лялькі, прафесійнасцю мастацкага афармлення і нечаканымі сцэнічнымі рашэннямі.

На жаль, некаторыя годныя творы падчас Нацыянальнай прэміі ўсё ж засталіся незаўважанымі. Прытым што ўвасабляюць цікавую і адметную тэндэнцыю ў беларускім тэатры: гаварыць з намі пра актуальнае сёння з выкарыстаннем сучаснага матэрыялу. Гэта спектакль у пастаноўцы Дзмітрыя Багаслаўскага «Саша, вынесі смецце», яго драматургічная праца — п'еса «Мабыць» у Цэнтры беларускай драматургіі. Ёсць у англійскай мове трапны выраз: каб зразумець іншага чалавека, трэба «прайсці мілю ў яго чаравіках». Акцёры на працягу ўсёй п'есы прымяралі чужы абутак, каб у выніку знайсці адказ на пытанне, хто ж такія беларусы і куды яны крочаць.

Куды ж крочыць беларускі тэатр?

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

■ Кніжны дом

# ВЯРТАННЕ «ВЯНКА»

**Легендарная кнігарня ў Траецкім зноў адчыніць дзверы ў дзень нараджэння Максіма Багдановіча**

**Аматары кнігі ведаюць: каб знайсці рэдкае, нават старажытнае выданне варта перадусім выправіцца ў «Вянок», што месціцца на беразе Свіслачы і спецыялізуецца на букіністыцы. Але ўлетку на інтэрнэт-сайтах пачалі з'яўляцца трывожныя навіны пра закрыццё крамы на рамонт і яе далейшы лёс, які на той час падаваўся нявызначаным. Не так даўно стала вядома, што «Вянок» усё ж не спыніць свайго існавання, але зменіць уладара і будзе працаваць у крыху іншым профілі. Так, крама ўвайшла ў вялікую сетку «Белкнігі». На пытанні «Звязды» пра лёс гэтай кнігарні пагадзіўся адказаць дырэктар «Белкнігі» Аляксандр ВАШКЕВІЧ.**



Фота Кастуся ДРОБАВА

— Магазін «Вянок», які пачаў працаваць у 1980-я гады, першапачаткова ўваходзіў у склад сеткі «Белкніга». Потым ён перайшоў на баланс Паліграфкамбіната імя Якуба Коласа. Але варта разумець, што гэта перадусім паліграфічнае прадпрыемства, спецыялізаванае на друку кніг, а не іх продажы. Таму і эканоміка, і асартымент тавараў у краме не зусім адпавядалі яго профілю дзейнасці. Пытанне стаяла нават пра закрыццё «Вянка». Натуральна, «Белкніга» як найбуйнейшае кнігагандлёвае прадпрыемства нашай краіны не магла пагадзіцца з гэтым, таму мы вырашылі вярнуць «Вянок» у сям'ю сваіх крам.

***— Пасля рамонту і змены ўласніка кнігарні ці адбудуцца змены ў профілі крамы? Яна застанецца скіраванай на букіністыку?***

— Магчыма, профіль крамы крыху зменіцца. У сетцы «Белкнігі» не адзін магазін спецыялізуецца на букіністыцы. Больш за тое, мы супраць таго, каб букіністыкаператвараўся ў пэўнага кшталту «здачу бутэлек» — калі можна знайсці кнігі на сметніку і прынесці іх у магазін на продаж. Тут мы перш за ўсё маем на ўвазе рэдкія кнігі, якія прадстаўляюць культурную каштоўнасць і могуць быць патэнцыйна цікавымі сучасным пакупнікам. Гэта не сродак узбагачэння здатчыкаў, якія ўспрымаюць кнігі як другасную сыравіну. Мы павысім патрабаванні да прадукцыі, што будзе здавацца, таксама пашырым у гэтай краме асартымент аддзелаў краязнаўства, турыстычных даведнікаў і кніг пра Беларусь у цэлым, нашу прыроду і дасягненні ў асобных сферах. У тым ліку — на замежных мовах. Так плануем напоўніцу скарыстацца размяшчэннем крамы ў турыстычным цэнтры Мінска.

***— У нашы дні кнігарні становяцца сапраўднымі цэнтрамі культуры. Тут ладзяцца прэзентацыі, арганізоўваюцца грамадскія абмеркаванні кніг. «Вянок» будзе запрашаць гасцей на імпрэзы?***

— Гэтая кнігарня і сёння працуе ў тэставым рэжыме. Яе афіцыйнае адкрыццё адбудзецца 9 снежня, у 125-ты дзень нараджэння Максіма Багдановіча. Мы запрашаем усіх на вялікае свята кнігі ў Траецкае прадмесце. А пасля «Вянок» сапраўды стане базай кніжнага клуба, дзе пісьменнікі з нашай падтрымкай змогуць праводзіць творчыя сустрэчы, прэзентацыі кніг, аўтограф-сесіі. У гэтым кірунку будзем працаваць з Саюзам пісьменнікаў Беларусі.

***— «Белкніга» досыць хутка пашыраецца, адкрываюцца новыя крамы. Магчыма, станеце манапалістам на айчынным кніжным рынку?***

— Паралельна з крамамі «Белкнігі» ў нашай краіне адкрываецца многа іншых кнігарняў розных фарматаў. Рынак сёння досыць свабодны. Можна казаць пра даволі моцную сетку oz.by, гэтыя магазіны з проста пунктаў выдачы заказаў інтэрнэт-крамы ператварыліся ў паўнавартасныя кнігарні. Сетка «Буквоежка», што складаецца з пяці крам, размешчаных у гандлёвых цэнтрах, таксама дазваляе казаць пра пэўную сістэму работы. У пачатку снежня ў Мінску адкрылася крама Cash and Carry з удзелам расійскага капіталу. Гэта магазін дробнага опту, дзе набываць кнігі змогуць прадпрымальнікі, маленькія суб'екты гаспадарання. Таму сцвярджаць, што «Белнікнга» становіцца манапалістам, нельга. Зараз развіваецца гандаль, альтэрнатыўны нашаму, ён досыць моцны. Нават калі казаць пра кропкавыя кнігарні, такія як «Кніжная нара», «Сон у Гогаля».

***— Але ж у нас у краіне кніжны рынак, па сутнасці, досыць маленькі. Не страшна ў такім выпадку, што хутка страціце вялікую частку прыбытку і не пераможаце ў гэтай канкурэнцыі?***

— Перамагчы павінен мацнейшы — якасцю кніг, іх асартыментам, цэнавай палітыкай, новымі формамі продажаў, акцыямі. І тут, канешне, плячо «Белкнізе» павінны падставіць айчынныя выдавецтвы. Бо менавіта з імі мы ў асноўным працуем. Камерцыйныя кніжныя сеткі і крамы не ўдзяляюць неабходнай увагі кнігам беларускіх выдаўцоў, аўтараў, выданням на беларускай мове. Таму я хацеў бы заклікаць пісьменнікаў і выдавецтвы ствараць якасныя творы, цікавы кантэнт — тады і ў «Белкнігі» будзе добрая будучыня. Мы разам пераможам у канкурэнтнай барацьбе.

***— Разважаем у асноўным пра сталіцу. А як жа рэгіёны? «Белкніга» ўжо заклала традыцыю адкрываць ці абнаўляць магазіны ў гарадах, якія прымаюць Свята беларускага пісьменства. Ці плануеце налета звярнуць увагу на Полацк?***




— У Полацку працуе кнігарня нашай сеткі. Зараз мы думаем пра тое, каб гэты магазін абнавіць, перафарматаваць знешне і па прынцыпах работы. Магчыма, ва ўзаемадзеянні з мясцовымі ўладамі зможам адкрыць і новую кнігарню. Зразумела, што для такога вялікага горада, значнага культурнага цэнтра адной кніжнай крамы недастаткова.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Пасля падзеі

# СПАСЦІГНУЦЬ НЕСПАСЦІГАЛЬНАЕ

## У кінапрэсы не было дэбатаў наконт уладальніка «Срэбра Лістапада»

**Француз Олівер Лакс ужо дзесяць гадоў жыве ў ісламскім каралеўстве Марока — напэўна, гэта можа стаць ключом да лепшага разумення яго карціны «Мімозы», створанай у жанры роўд-муві і разбітай на тры часткі адпаведна пазіцыям для малітвы: схіліўшыся, стоячы, распасцёршыся. Вы толькі ўявіце: аранжавыя пустыні, гарачыя настолькі, што плавіцца экран, наўючаныя коні і стомленыя людзі пераадольваюць горныя ландшафты дзеля жадання шэйха памерці ў роднай Сіджыльмасе, адначасова ў сучасным гарадку натоўп людзей чакае, каму з іх сёння дадуць работу. Мараканская рэальнасць з яе беспрацоўем, дзікасцю, нецывілізаванасцю пераможацца містычным шляхам каравана (ці, можа, гэта маральны шлях авантурыста Ахмеда альбо ўласнае спасціжэнне жыццёвых глыбінь рэжысёрам). Два вымярэнні пранікаюць адно ў другое — не заўважыш. Гэтым разам дазволю сабе напісаць пра ўладальніка не «золата», а «срэбра» кінафестывалю «Лістапад», якім сталі «Мімозы», з той нагоды, што сама прымала ўдзел у прызначэнні гэтай узнагароды. Дзіўная карціна трапіла ў лік фаварытаў кожнага з пяці членаў журы кінапрэсы «Лістапада».**



Дэбютны фільм Олівера Лакса «Усе вы капітаны» зняты ў 2010 годзе. Калі мінулая работа была добра прынятая, то «Мімозы» яшчэ і атрымалі вышэйшую ўзнагароду Тыдня крытыкаў у Канах — адна-го з найважнейшых аглядаў, што праходзіць паралельна Канскаму кінафестывалю. Эфектная загадкавая назва тлумачыцца проста: сцэнарый быў напісаны ў аднайменнай кавярні. Паралельна з «Мімозамі» брытанскі рэжысёр Бэн Рыверс зняў карціну «Неба дрыжыць, і зямля баіцца, і два вокі не браты адно аднаму», першая частка якой паказвае здымку за кадрам «Мімоз», а другая экранізуе апавяданне «Далёкі выпадак» Дэвіда Боўлза, дзе Олівер Лакс выконвае галоўную ролю. Дзве карціны ў выніку адна другую дапаўняюць, але пра гэта пазней.

Бязмежжа пустыні, снежныя горныя вяршыні, караван і традыцыйнае шматслойнае адзенне, дзіўны персанаж Шахіб з яго жэстыкуляцыяй, голасам і манерай сябе паводзіць, які зусім невыпадкова далучыўся да каравана. Олівер Лакс добра разгледзеў мараканскі краявід, знайшоў у ім натхненне і ў выніку стварыў нешта неймавернае. Гэта падманліва простая, але з падтэкстам, гісторыя завараджвае — недакладныя межы паміж рэальным і містычным, паўтоны, паўсловы, паўнамёкі. Працуе гэта дзіўным чынам — ты не бачыш гэтыя ніці, затое адчуваеш іх на падсвядомым узроўні. Тут не месца дакладным матэрыям, тлумачэнням, катэгорыям і іншым страшным словам. «Мімозы», калі дазволіць сабе такое шаблоннае параўнанне, — гэта паэзія, прычым вельмі тонкая.

Караван трымае шлях на Сіджыльмасу і з той нагоды, што шэйх адчувае хуткую смерць, людзі вырашаюць скарацiць яго праз горы, дарогі якіх ніхто не ведае. У рэшце рэшт, шэйх паміраe, тады Ахмед абяцае за грошы давезці цела шэйха да яго радзімы і цягне за сабой яшчэ некалькі чалавек. Караван раздзяляецца — цела шэйха застаецца з Ахмедам. Ці трэба казаць, што жаданне памерлага выканана не будзе: душа яго не адпавядае на спачын, а працягне сваю вандроўку ў хуткім цячэнні горнай ракі.

Адны з самым захапляльных эпізодаў «Мімоз», можа, і кіно ўвогуле, — гэта фантастычныя праезды трох машын таксі па дарогах пустыні. Яны: гэтыя агні ад фар, узняты пыл, наравістасць — пад падабранае гукавое суправаджэнне выглядаюць тут як частка іншаземных, містычных цывілізацый. Куды яны едуць, чаму ўтраіх, як яны тут аказаліся? Для нашага непрызвычаенага да такіх антуражаў вока гэта ўвогуле іншапланетна. Сапраўды, у адным з аўтамабіляў той невыпадковы персанаж Шахіб атрымлівае заданне дапамагчы каравану і асаблівa сачыць за Ахмедам. Зноў пытанні — хто дае яму даручэнне, хто ён сам, дзеля чаго трэба сачыць за караванам? У пэўным сэнсе гэтыя эпізоды становяцца варыяцыяй кіношнага штампа, калі прадстаўнікі мафіі, гангстарскіх і паўзаконных структур вядуць перамовы ў аўтамабілях. Гэтыя сцэны з адсылкамі паказальныя — пра штамп вы нават не ўспомніце, настолькі іншым, незнаёмым і дзіўным гэта выглядае.

Шахіб накіроўваецца за сваім «аб'ектам», які насамрэч не ведае дарогу да Сіджыльмасы (падманyў астатніх) і ўвогуле не вельмі перажывае за ўдалае выкананне місіі. Для простай гісторыі, ступень умоўнасці якой нам невядомая, ствараецца кантэкст маральны і рэлігійны. «Мімозы» — гэта, канешне, пошук. Гісторыя без відавочнага прытчавага выніку, дакладнай логікі і стандартнай мадэлі развіцця — яна ў пэўным сэнсе сімвалізуе, што трактоўкі і разуменне не могуць быць адназначнымі. Рэлігійны, кажуць, вестэрн. Галоўнае ў «Мімозах» — не вынік, а сам пошук, бо ён, трэба разумець, становіцца першапачаткам. Сам Лакс праз гэта прыходзіць навобмацак, імправізацыйна, інтуітыўна — але ў дачыненні да стварэння фільма дысцыпліна мяняецца, бо ў адрозненне ад жыццёвага адказу рэжысёр ведае, як стварыць сапраўднае кіно. Таму шлях у фільме становіцца самакаштоўнай з'явай.

А з той нагоды, што сам «пошук» — нешта недакладнае, няяўнае, неадчувальнае, карціна яму адпавядае і ў нейкай ступені сыходзіць ад рэальнасці. Калі фільм Рыверса становіцца побач з «Мімозамі», ён на гэты пошук адказвае цытатай аднаго з персанажаў, чытаць якую трэба адназначна: за дзёрзкі імпэт засведчыць сваё разуменне жыцця, рэлігіі, маралі і іншых складаных катэгорый чалавек можа і паплаціцца. Сэнс дарогі — у дарозе.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Словы на ўспамін

# «Гудзевічы — гэта музей. Музей — гэта Белакоз»

## З жыцця пайшоў выдатны краязнавец Гродзеншчыны

**Гэтымі днямі не стала слыннага настаўніка і краязнаўца Алеся Белакоза. Сапраўдны патрыёт, адданы руплівец на ніве беларускай справы, за сваё жыццё ён паспеў шмат таго зрабіць і пакінуць яскравы след. Яму было 88 гадоў.**

Алесь Белакоз — стваральнік Гудзевіцкага літаратурна-краязнаўчага музея — адзінага школьнага музея, які мае статус дзяржаўнага. Але, самае галоўнае, праз вывучэнне роднага краю ён выхаваў не адно пакаленне людзей, апантаных даследаваннем Бацькаўшчыны і літаратурнай справай.

— Ён заснавальнік і стваральнік нашага музея. Светлы чалавек. Памяць пра яго будзе захоўвацца, пакуль існуе наш музей, — кажа дырэктар Гудзевіцкага дзяржаўнага літаратурна-краязнаўчага музея Кацярына БАСІНСКАЯ, і ў голасе яе чуецца сапраўдны сум. — Ён здолеў знайсці і аб'яднаць усіх аднадумцаў. Яго справа і сёння жыве. Мы будзем працягваць яе. Гудзевічы — гэта музей. Музей — гэта Белакоз... Усё пачалося яшчэ ў 1965 годзе, калі ён адкрыў кабінет беларускай мовы і літаратуры. Ужо ў 1968 годзе была разгорнута першая экспазіцыя. У 1984 годзе пасля рамонту пачалі працаваць чатыры экспазіцыйныя залы. У 1990 годзе музей атрымаў статус дзяржаўнага, былі адкрыты залы лёну, ткацтва, народнай медыцыны, гісторыі Гудзевічаў... Гэта не мемарыяльны музей, прысвечаны аднаму чалавеку. Гэта музей пра ўсіх беларусаў, які прапагандуе нашу культуру і самабытнасць.

У свой час, распачынаючы работу ў музеі, Алесь Белакоз наладзіў адметную форму працы — перапіску сваіх вучняў з вядомымі пісьменнікамі, кампазітарамі, мастакамі, артыстамі. «Яны дасылаюць ім лісты, — казаў Алесь Мікалаевіч у адным са сваіх інтэрв'ю. — А гэта запамінаецца, пакідае след у жыцці чалавека. Я імкнуўся выхаваць праз музей беларускіх патрыётаў....»

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска»

**Застройщик** – государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей от 27.02.2014 за № 190580553.

**Место нахождения:** 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а.

Тел./факс: 204-67-99, 399-53-94.

**Режим работы** – 8.45–18.00, обед 13.00–14.00; пятница 8.45–16.45, выходные дни: суббота, воскресенье.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1) Жилой дом № 3 по ул. Киреенко;
2) Жилой дом № 10 по ул. Чигладзе;
3) Жилой дом № 36 по ул. Ю. Семеняко;
4) Жилой дом № 42 по ул. Ю. Семеняко.
5) Жилой дом № 3 по ул. Горецкого;
6) Жилой дом № 44 по ул. Семеняко;
7) Жилой дом № 101А по ул. Одоевского.

**Застройщиком получены:**

- акт выбора места размещения земельного участка, утвержденный председателем Минского городского исполнительного комитета 24.06.2009;
- экспертное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 29.01.2015 № 1138-15/14; от 12.03.2015 № 143-15/15; от 26.01.2016 № 1211-15/15; от 05.02.2016 № 01-09/837 дополнение к экспертному заключению от 26.01.2016 № 1211-15/15;
- решения Мингорисполкома об организации строительства объектов, изъятии, предоставлении земельных участков и разрешения строительства с изменениями и дополнениями от 23.10.2014 № 2632; от 03.03.2016 № 599; от 11.05.2016 № 1315; от 05.03.2015 № 511; от 16.07.2015 № 1924; от 18.08.2016 № 2394; от 13.10.2016 № 3003;
- разрешение инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 12.05.2016 № 2-208Ж-011/16; от 30.05.2016 № 2-208Ж-011/16;
- договор генерального подряда на строительство с ОАО «МАПИД» от 02.05.2016 № 02/05/2016.

**Информация о проекте.**

Проектом предусмотрено строительство объекта «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева. Микрорайон № 3. (2-я очередь строительства). Жилой дом № 12 по генплану».

Жилой дом на 118 квартир состоит из двух секций серии М464М-16 с теплым чердаком, техподпольем, остекленными лоджиями. В доме в осях 1-2 запроектировано помещение товарищества собственников, а в осях 3-4 помещение электрощитовой. Дом в компоновочных осях 1-2 имеет 16 этажей, в осях 3-4 имеет 14 этажей.

Здание решено в перекрестно-стеновой конструктивной системе с несущими наружными стенами и внутренней продольной стеной, поперечными внутренними стенами лестничной клетки и межсекционными внутренними стенами со скрытым связевым каркасом.

Лифтовые установки здания приняты грузоподъемностью 400 и 1000 кг. Для физически ослабленных лиц предусмотрено в каждой секции подъемное устройство при входах в жилой дом для пользования лифтом грузоподъемностью 1000 кг.

Наружная и внутренняя отделка по требованию заказчика решена на основе применения современных материалов отечественного производства.

**Наружная отделка** – покрытие защитно-декоративным полимерным составом.

**Внутренняя отделка** – оклейка стен и потолков обоями в жилых комнатах, прихожих, кухнях; улучшенная окраска акриловой влагостойкой краской в ванных и санузлах. Покрытие полов жилых помещений и кухонь – линолеум на теплозвукоизолирующей подоснове, в ванных и санузлах – керамическая плитка.

В соответствии с решением Мингорисполкома от 18.08.2016 № 2394 для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по месту работы, предлагаются для строительства по договорам создания объекта долевого строительства:

- для работников Белорусского государственного университета – 57 (пятьдесят семь) квартир;
- для работников РУП «Научно-практический центр НАН Беларуси по механизации сельского хозяйства» и других организаций аграрного профиля НАН Беларуси – 56 (пятьдесят шесть) квартир.

Стоимость 1 кв. метра общей площади квартиры с учетом прогнозных индексов на дату опубликования проектной декларации составляет:

- для нормируемой площади **1 058** рублей **29** копеек.
- для площади превышающей нормируемую **1 202** рубля **09** копеек.

Начало строительства – май 2016 года.

Планируемый срок ввода объекта в эксплуатацию – апрель 2017 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а, к. 101, тел. 399-53-94.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор;
- быть готовым оплатить в течение 3 рабочих дней с даты получения договора 40% стоимости объекта долевого строительства.



**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» вносит в извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Республиканскому унитарному предприятию «Производственное объединение «Белоруснефть» на праве хозяйственного ведения, назначенного на 10.00 20.12.2016 г., следующие изменения: начальная цена предметов торгов и сумма задатков указаны без НДС в соответствии с п.п. 2.3 п.2 ст.93 НК РБ.**

Полный текст извещения опубликован в газете «Звязда» от 18.11.2016 г. №223.

Дополнительная информация по тел. (0232) 70-46-47.

УНП 490318588



# Извещение о проведении 15 декабря 2016 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № | Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Местонахождение предмета торгов | Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб. (бел. руб. образца 2000 года) | Размер задатка, бел. руб. (бел. руб. образца 2000 года) |
| 1. | Помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения с инвентарным номером 500/D-7025745, общая площадь 624,8 кв. м | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 25 | 746 934,14 (7 469 341 400) | 74 000,00 (740 000 000) |
| 2. | Административное помещение с инвентарным номером 500/D-708150242, общая площадь 2008,7 кв. м; теплосети (инв. №01-178); электросети (инв. №01-169); сети водопровода (инв. №01-170) | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 27 | 2 319 496,65 (23 194 966 500) | 150 000,00 (1 500 000 000) |
| 3. | Административное помещение с инвентарным номером 500/D-708150241, общая площадь 11,7 кв. м | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 26 | 23 582,33 (235 823 300) | 2 300,00 (23 000 000) |

**Продавец имущества:** ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220050, г. Минск.

**Организатор торгов:** коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет коммунального унитарного предприятия «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **15 декабря 2016 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 05.12.2016 по 13.12.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**

**(017) 327-48-36 (коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»);**

**(017) 200-99-78, (029)350-46-23 (ОАО «Минскремстрой»).**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

**Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, тел. (0212) 426162**

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды |
|---|
| Лот №1. Право заключения договора аренды сроком на 3 года земельного участка с кадастровым №240100000002009271 площадью 0,0145 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Транспортная для строительства объекта «Модульная мастерская шиномонтажа по ул. Транспортная в г. Витебске». Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: отсутствуют. **Нач. цена (с учетом/до деноминации)**: 437,35/4 373 500 бел. руб. **Задаток (с учетом/до деноминации):** 43,74/437 400 бел. руб. |
| Дата, время и место проведения аукциона: **05.01.2017 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: **с 05.12.2016 с 8.30 по 04.01.2017 до 17.30** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в рабочие дни с 8.30 до 17.30 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Реквизиты для внесения задатка: р/с 3642302000280 в ф-ле № 200 Витебское обл. управление ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 635, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. Условия аукциона: заключить с Витебским горисполкомом договор аренды зем. участка; получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца, с момента гос. регистрации права на зем. участок; при необходимости привлечь инженерную организацию (инженера) для оказания инженерных услуг в строительстве в порядке и на условиях, предусмотренных законодательством и договором на оказание инженерных услуг. |

Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. **Условия аукциона:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за право заключения договора аренды зем. участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения. Инженерные коммуникации и сооружения на зем. участке отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. **Для участия в аукционе** граждане, индивидуальные предприниматели и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. **Конт. тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.**



# РУП «Институт недвижимости и оценки»

**по поручению Борисовского межрайонного отдела управления по г. Минску и Минской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества должника**

| ОПИСАНИЕ |
|---|
| **Лот № 1:** Капитальное строение с инв. № 601/С-27411 (Здание гаража на 8 мест) по адресу: Минская обл., Логойский р-н, Крайский с/с, аг. Малые Нестановичи, пер. Центральный, 6В. Общая площадь – 767,2 кв. м. Год постройки – 1972. Назначение: здание специализированное транспорта. Начальная цена продажи – 68 256,36 бел. руб. Задаток – 6 820,00 бел. руб. |
| **ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК** |
| Лот № 1 расположен на земельном участке площадью 0,1623 га с кадастровым номером 623283804804804000002. Целевое назначение – земельный участок для обслуживания автомобильного гаража. Право аренды по 27.03.2115 г. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений прав: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов (водоохранная зона реки Дзвонка) площадь 0,1623 га; охранная зона электрических сетей, площадь 0,0611 га |
| **УСЛОВИЯ** |
| Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), ему присваивается статус «Претендент на покупку».<br>Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан произвести оплату всей стоимости Объекта не позднее 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.<br>Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.<br>Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, обращённый в доход государства (имущество должника), осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.<br>На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона. |
| **Аукцион состоится 06.01.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%** |
| Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by.**<br>Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества должника по поручению Борисовского межрайонного отдела (Лот № 1), **проводимом 06 января 2017 г.**<br>Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.<br>Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений и задатков – **04.01.2017 в 10.00.**<br>Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Лота: Шостак Вера Николаевна, 8(01774) 5-31-32 и 8(029) 339-39-26.<br>Организатор аукциона вправе снять лот с торгов по письменному указанию подразделения Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным. |

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550-09-52, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**


## Андрэй КРАЙНОЎ:

# «Не пасыпаць галаву попелам»

### Спартыўны дырэктар СКА пра тое, што чакае клуб пасля «вылету» з Еўракубка

**У сёлетнім сезоне выступленне віцэ-чэмпіёна краіны па гандболе, клуба з самымі багатымі традыцыямі, на еўраарэне складваецца не так паспяхова. Сцэнарый падобны на леташні: СКА супрацьстаяў той жа «Хард», толькі турам ранней, і той жа «Сен-Рафаэль», толькі яшчэ не ў групе. Французы ўжо другі год запар спыняюць мінскіх «армейцаў» на шляху ў Еўропу. Пасля перамогі (+2) на хатняй пляцоўцы падапечныя Ігара Папругі ўступілі ў гасцявым паядынку 8 мячоў і не выйшлі ў групавы раўнд Кубка ЕГФ.**



***— Андрэй Віктаравіч, як ацэніце выступленне каманды?***

— Можна сказаць, што ў гэтым годзе наша прысутнасць там складалася з 4 матчаў. Першыя гульні з аўстрыйскім «Хардам» скончыліся са станоўчым для нас вынікам. Наступным сапернікам стаў моцны, топавы французскі «Сен-Рафаэль». Некаторыя недаацэньваюць узровень гэтага клуба, забываючы пра тое, што чэмпіянат Францыі — другі наймацнейшы чэмпіянат у свеце, а «Сен-Рафаэль» — яго леташні сярэбраны прызёр. Тое, як хлопцы згулялі дома, парадавала. Так, яны не змаглі ўтрымаць перавагу ў 6 мячоў, напэўна, з-за сваёй маладосці: гульцам не ўдалося захаваць «халодныя галовы», і ў выніку канцоўка атрымалася змазанай. У Францыі гулялі нядрэнна, але моцна падвяла рэалізацыя момантаў у атацы, плюс бліскучая гульня варатара «Сен-Рафаэля» не дазволіла нам атрымаць перамогу.

Практычна ўпэўнены, што наш сапернік будзе гуляць у фінале чатырох Кубка ЕГФ. Няўжо такі вынік СКА, дзе пераважнай большасці гульцоў няма і 22 гадоў, я магу назваць правальным?

***— Гэта значыць і прэтэнзій асаблівых да гандбалістаў у вас няма?***

— Што я магу сказаць 20-гадоваму Аляксандру Падшывалаву, які гуляе супраць вопытнага Вісэма Хмама? Што ён на 100 працэнтаў павінен яго абыграць? Або што мне зрабіць з Вячаславам Боханам, які два гады таму пачаў займацца гандболам, а сёння выходзіць супраць нядаўняга лідара «Барселоны» Даніэля Сарм'ента? Нашы хлопцы і так зрабілі ўсё магчымае. У нас вельмі таленавітая моладзь, і ўсе — з беларускімі пашпартамі. Таму цяпер нельга спыняцца і пасыпаць галаву попелам, а, наадварот, трэба іх падтрымаць, дапамагчы, бо праз месяц 6-7 гульцоў СКА адправяцца ў зборную, каб рыхтавацца да чэмпіянату свету ў Францыі.

***— Як плануеце закрываць пазіцыю Арцёма Каралька, які ўжо гуляе за «Сен-Рафаэль»?***

— Нам не ўдалося ўтрымаць Арцёма, мы не змаглі прапанаваць яму ўмовы лепшыя, чым тыя, якія прапанавалі французы. Не варта забываць, што ў нас ёсць лінейныя Вячаслаў Бохан і Дзяніс Крыцкі, мы на іх разлічваем.

На два бліжэйшыя гады мы хацелі б крыху закрыцца і паспрабаваць захаваць сённяшні склад. Стараемся тлумачыць гульцам, што адна справа з'ехаць у клуб-сярэднячок, а другая — у топавую каманду. Паверце, мы вельмі многае змянілі ў клубе, каманда стала больш моцнай, больш цікавай, гэта адзначаюць усе. Ёсць моманты, якія бачны ўжо сёння, некаторыя яшчэ не так прыкметны.

Гадоў 5-6 назад нашы «армейцы» наогул нікому не былі патрэбныя, мы радаваліся, калі нехта патэлефануе і проста спытае пра кагосьці з гульцоў. А сёння ў мяне разрываецца тэлефон, нашых гандбалістаў пастаянна турбуюць агенты, спрабуюць іх кудысьці перавабіць.

***— Якія задачы зараз стаяць перад СКА?***

— У снежні нашы гульцы павінны падысці ў добрай форме да нацыянальнай зборнай. Ужо сёння Ігар Папруга і Вадзім Сашурын працуюць над гэтым. Ну а потым ніхто не адмяняў барацьбу з «Гомелем» і БГК Мяшкова за лідарства ва ўнутраным першынстве, плюс свае задачы стаяць у нас і ў Балтыйскай лізе.

***— Чаму СКА не заявіўся ў SEHA-лігу?***

— Сёння мы маем усё — добрую залу, наладжаную інфраструктуру, флэт-панэлі і, галоўнае, — каманду, якая дакладна не была б там самай слабай. Мы звярталіся ў SEHA-лігу з афіцыйным лістом, але станоўчы адказ пакуль нам не даюць.

***— Вялікі крок наперад у апошні час зрабіла і маркетынгавая служба СКА, вылет з Кубка ЕГФ не затармозіць гэтую працу?***

— Так, сёння мы задаволеныя, што наладжана больш цесная работа з балельшчыкамі, на нашых трыбунах іх становіцца ўсё больш. Стараемся прыдумаць штосьці новае, цікавае, раней ва «Уруччы» было пуста і глуха, а цяпер — пункты харчавання, піва, атрыбутыка.

Бліжэй да вясны ў Мінск прыедзе добрая каманда — ЗТР, калі мы трапім у фінал чатырох Балтыйскай лігі, то яго таксама прыме наша сталіца.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

■ Дэмаграфія

# ПА-СЯМЕЙНАМУ

## Даследаванне дапаможа разабрацца ў пытаннях гендарнага раўнапраўя і старэння нацыі

Сённяшнія сем'і сталі менш стабільнымі, больш складанымі і вельмі разнастайнымі ў плане адносін паміж пакаленнямі і поламі. Старэнне насельніцтва, нараджэнне дзяцей у няпоўных сем'ях, бяздзетнасць і іншыя актуальныя пытанні дэмаграфічнай палітыкі будуць вывучаца падчас сацыялагічнага даследавання «Фарміраванне сям'і, стабільнасць сямейных адносін і нараджальнасць у зменлівых сацыяльна-эканамічных умовах жыцця беларусаў», якое пачнецца ў краіне ў лютым 2017 года.

Яно праводзіцца ў межах праекта «Падтрымка рэалізацыі нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь» і каардынуецца Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны Беларусі. Яшчэ да пачатку даследавання існуе вялікі попыт на яго вынікі, і навукоўцы задумваюцца над тым, у якіх галінах можна будзе скарыстаць атрыманую інфармацыю.

— Даследаванне мае практычную карысць. Яго даныя трэба разглядаць шырэй, чым у кантэксце дэмаграфічнай палітыкі. Яны могуць стаць карыснымі не толькі для навукоўцаў асяроддзя, але і для ўладных структур, якія прымаюць рашэнні. Мы зможам прааналізаваць пытанні гендарнага раўнапраўя, разгледзець праблему старэння нацыі, — адзначыла **Алена КАСЬКО, намеснік прадстаўніка Фонду ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) у Беларусі.** — У 2020 годзе Міністэрству працы і сацыяльнай абароны насельніцтва зноў прыйдзецца задумацца, якой павінна быць далейшая сямейная палітыка, і вынікі нашых апытанняў дазволяць перагледзець і прааналізаваць існуючую метадалогію працы і ў наступнай праграме дэмаграфічнай бяспекі ўжыць атрыманыя вынікі.

**У даследаванні прыме ўдзел 10 000 рэспандэнтаў ад 18 да 69 гадоў. Першыя вынікі даследчыкі спадзяюцца атрымаць увосень 2017-га, а папярэдні аналіз сабранай інфармацыі адбудзецца ў маі. Даследаванне, на якое будзе затрачана больш за $200 тысяч, будзе праходзіць у цеснай узаемасувязі з Нацыянальным статыстычным камітэтам Беларусі.**

Яна выказала спадзяванне, што ў Беларусі ўдасца рэалізаваць усе тры хвалі даследавання, якія праводзяцца раз на тры гады з удзелам адных і тых жа рэспандэнтаў. На працягу трох этапаў даследчыкі вывучаюць, як розныя жыццёвыя фактары: шлюбы, нараджэнне дзяцей, смерць, магчымыя фінансавыя ці псіхалагічныя выпрабаванні, рэалізаваная сацыяльная палітыка і іншае ўплываюць на рэпрадуктыўныя паводзіны чалавека і яго сямейнае жыццё. Менавіта такім чынам праграма «Пакаленні гендар» праводзіцца з 2001 года ў розных краінах свету. Наша рэспубліка стане 20-й кропкай на міжнароднай карце гендарных даследаванняў.

— Першая хваля ў Беларусі будзе праводзіцца з прымяненнем новых інструментаў — камп'ютарных планшэтаў. Гэта новы для нас спосаб збору даных, — падкрэсліў **Віктар ПРАЎДЗІВЕЦ, прадстаўнік Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ.** — Гэты праект не толькі міжнародны, але і параўнальны. Менавіта апошні аспект вельмі важны, бо толькі праз параўнанне даных, атрыманых з розных краін, сітуацыя вымалёўваецца больш дакладна, з'яўляецца магчымасць прагназаваць яе развіццё. Тое, што ў розных краінах даследаванне праводзіцца па падобнай метадыцы, з выкарыстаннем аднолькавага інструментарыя, дазваляе адшукаць многія пытанні, якія шляхам закрытага даследавання проста не выявяцца.

Анкета для беларусаў такая ж, як і ў Еўропе. Рэспандэнты будуць адказваць на самыя розныя пытанні: узаемадзеянне ў сям'і, карыстанне рэсурсамі, размеркаванне абавязкаў па дому і іншыя. Закрануты акалічнасці з жыцця грамадзян дазволяць даследчыкам зрабіць высновы практычнага характару.

— Адказы на пытанні па гадах, калі, напрыклад, з'яўляліся дзеці ў сем'ях, мы зможам пакласці на графік увядзення ў краіне розных мер дзяржаўнай сацыяльнай дапамогі, — зазначыла **Вольга ЦЯРЭШЧАНКА, выкладчыца факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ.** — Гэта дазволіць прасачыць, наколькі дзяржаўная сацыяльная і сямейная палітыка дапамагае і спрые дэмаграфічнаму аднаўленню.

Цікавымі ў практычным плане стануць і атрыманыя звесткі пра ўплыў папярэдняга вопыту на далейшае развіццё чалавека. Можна будзе, напрыклад, зрабіць высновы, як размеркаванне абавязкаў па гаспадарцы і выхаванні дзяцей уплывае на жаданне нарадзіць яшчэ адно. Даведацца, які ўплыў аказвае догляд родных састарэлага ўзросту на партнёрскія адносіны ў сям'і. Прааналізаваць, як пары прызвычайваюцца да ўмоў рэчаіснасці на працягу жыцця.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Экалагічны лікбез

# ПЕРШЫ СНЕГ, ПЕРШЫ ЛЁД...

## Каб яны не былі азмрочаны бядой і адказнасцю за парушэнні

**Снег і першыя, няхай і невялікія пакуль, маразы — не прычына для рыбаловаў і паляўнічых закінуць свой занятак. Наадварот, у гэту пару года перад імі адкрываюцца новыя магчымасці. Тут, галоўнае, аддавацца ўпадабанаму віду адпачынку не толькі з розумам, але і з аглядкай на заканадаўства. Як тое зрабіць, кансультуюць спецыялісты Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**




### «КАЛЬКУЛЯТАР» ДЛЯ СОМА ПАДЧАС НЕРАСТУ

**На Краснаслабодскім вадасховішчы работнікі Нясвіжскай міжрайінспекцыі затрымалі двух жыхароў Клецка, якія рыбачылі пяццю сеткамі. 58 кілаграмаў вылаўленай рыбы абыдуцца браканьерам у вялікую суму — каля трох тысяч рублёў. Адкуль такая лічба?**

Больш за дзве тысячы парушальнікі вымушаны будуць заплаціць за восем асобін сома. На яго здабычу цяпер устаноўлена забарона, адпаведна такса пры разліку шкоды, устаноўленая згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №580 ад 8.12.2005 года (у апошняй рэдакцыі), павялічваецца ў тры разы. Астатняя рыба — дзесяць шчупакоў, дванаццаць карасёў і лешч — абыдуцца амаль у тысячу рублёў. Прычым гэтыя сумы з'яўляюцца толькі пакрыццём нанесенай шкоды. Дадаткова да іх па рашэнні суда можа быць прызначаны штраф ці іншае пакаранне. Браканьераў чакае крымінальная адказнасць па частцы 2 артыкула 281 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь «Незаконная здабыча рыбы ці іншых водных жывёл».

### РЫХТУЕМСЯ ДА ЗІМОВАЙ РЫБАЛКІ З АСЦЯРОГАЙ І ПА ПРАВІЛАХ

**З надыходам халадоў многія пачынаюць задумвацца аб зімовай рыбалцы, якая па сваёй папулярнасці не саступае лоўлі рыбы на адкрытай вадзе, а часам і прыкметна пераўзыходзіць яе. Рыбная лоўля зімой прыцягвае даступнасцю любых месцаў на вадаёмах і ва ўсе дні.**

Існуюць чатыры асноўных спосабы лоўлі рыбы з лёду: на паплавочную вуду, на мармышку, вертыкальную гульню блешняй і лоўля жарліцамі. Жарліцы і кружкі — гэта снасці для лоўлі драпежных відаў рыб: акуня, ментуза, шчупака, судака — на жыўца. Яны вельмі папулярныя ў рыбаловаў, бо даволі здабычлівыя. Рыбакі часцей ловяць рыбу на самаробныя жарліцы, снасці прамысловай вытворчасці, як правіла, выкарыстоўваюцца нячаста.

Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства забараняецца лавіць рыбу з выкарыстаннем кружкоў, жарліц, стаўкоў, так званых калабашак і іншых аналагічных сістэм і абсталявання ў начны час сутак, а таксама без указання на іх прозвішча і ініцыялаў чалавека, які вядзе лоўлю рыбы. Нельга пакідаць устаноўленыя прылады рыбалоўства без візуальнага кантролю — у выпадку выяўлення яны будуць канфіскаваныя.

Пры лоўлі рыбы з лёду не варта забываць пра меры бяспекі. Лічыцца, што выходзіць на яго можна, калі таўшчыня дасягае не менш за пяць сантыметраў. Мае значэнне і стан лёду, паколькі яго трываласць залежыць ад тэмпературы вады і паветра. Часам тых самых пяці сантыметраў можа аказацца недастаткова, напрыклад, калі за станаўленнем лёду наступіла адліга або пад ім мелкаводдзе з зараснікамі водарасцяў.

### БЕЗ СМЕЦЦЯ КАЛЯ ЛУНКІ

**Вада і рыба — бясцэнныя дары прыроды, што непарыўна звязаны паміж сабой. Чалавек карыстаецца гэтымі рэсурсамі пастаянна, таму і адносіцца да іх павінен рацыянальна. Тым не менш культура прыродакарыстання некаторых суайчыннікаў пакідае жадаць лепшага...**

Многім рыбакам неаднойчы даводзілася выцягваць з вадаёма на кручку самыя нечаканыя рэчы — абутак, адзенне, бытавыя прадметы. Часта гэтыя «трафеі» пакідаюць іх жа таварышы пасля зімовай рыбалкі. А яшчэ шмат іншага смецця пасля раставання лёду асядае на дно або прыбіваецца да берага. Між тым Правілы вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства абавязваюць рыбаловаў падтрымліваць належны санітарны стан рыбалоўных угоддзяў, не пакідаць на іх берагах, а таксама на лёдзе смецце і іншыя адыходы. За выкананнем гэтых патрабаванняў дзяржінспектары будуць пільна сачыць на працягу сезона. Злосных парушальнікаў прыцягнуць да адказнасці ў выглядзе штрафу ў памеры да 20 базавых велічынь.

Не варта забывацца рыбакам і пра культуру паводзін. Ужыванне падчас зімовай рыбалкі спіртных напояў парушае незваротнымі наступствамі — ад абмарожанняў і траўмаў да гібелі (падзенне на слізкім лёдзе, трапленне ў палонку). Часам у экстрэмальных умовах, калі трэба ацаніць абстаноўку і прыняць правільнае рашэнне, нецвярозы рыбалоў не ў стане хутка гэтага зрабіць — яго рэакцыя і кемлівасць замаруджаныя. Лепш за ўсё саграваццa гарачай гарбатай, кавай ці булёнам.

❍ **БУДЗЬ У КУРСЕ!**

### Уведзена забарона на рыбалоўства на веснавы перыяд

**Аматарскае рыбалоўства забаронена на некаторых вадаёмах, участках рэк і каналаў краіны ў веснавы перыяд. Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя №31 ад 6 кастрычніка 2016 года, якая апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

З 1 красавіка па 30 мая лавіць рыбу нельга ў навакольлі Гродна на Аўгустоўскім канале ад шлюза каля вёскі Нямнова да месца ўпадзення ў Нёман, а таксама ў пойменных вадаёмах ракі (затокі каля вёсак Келбасікі і Беражаны). У Мастоўскім раёне забарона ўведзена на азёрах Стары Нёман-1 (каля вёскі Харціца), Вінабойскае і Новае (каля вёскі Навінка), затоцы каля вёскі Дубна. У Магілёве і прыгарадзе аматарскае рыбалоўства забаронена на ўчастку Дняпра і прылеглых вадаёмах ад вадазбору Магілёўскага аўтамабільнага завода ім. С.М. Кірава да вусця ракі Дзебра, у Свіслацкім раёне Гродзенскай і Пружанскім раёне Брэсцкай абласцей — на ўчастку ракі Нараў ад паўднёва-заходняга вугла квартала 176 да паўднёва-заходняга вугла квартала 206 Ашчэпскага лясніцтва нацпарка «Белавежская пушча».

З 20 сакавіка па 18 мая будзе дзейнічаць забарона ў Лунінецкім раёне на працягу 2,5 кіламетра ўверх па Мікашэвіцкім канале да месца ўпадзення ў Прыпяць і на 500 метраў уверх і ўніз па цячэнні ракі. Адпаведнае рашэнне прынята на падставе Правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства. Пастановы №9 ад 14 сакавіка 2012 года і №6 ад 19 сакавіка 2014 года прызнаюцца страціўшымі сілу. Пастанова ўступіла ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

### ЗА ШТО ЗАПЛАЦІЎ, ТОЕ І ЗДАБЫВАЙ

**Трох казуль і дзіка падстрэліў жыхар Мсціслаўскага раёна. І паляванне можна было б лічыць удалым, калі б не адно «але»: па дакументах мужчына меў права здабыць толькі дзіка. Плаціць за гэта не трэба, больш за тое, самім паляўнічым выплачваюць па дзве базавыя велічыні за кожную здабытую асобіну (праўда, забіраць мяса дзіка забаронена). А тут у выніку мужчына павінен выплаціць вялікую суму грошай і адказаць за свае дзеянні па крымінальнаму артыкулу.**

А выйшла так, што калега паляўнічага па захапленні аплаціў здабычу казулі, але выйшаў на паляванне з гладкаствольнай стрэльбай і ў жывёл не папаў. У жыхара ж Мсціслаўскага раёна пры сабе быў наразны карабін «Сайга» з прыцэлам начнога бачання. Вось тады мужчыны і егер, які паляваў з імі, відавочна, вырашылі «дамовіцца».

Пачуўшы ў лесе два дзясяткі стрэлаў, групу паспяшаліся праверыць работнікі Мсціслаўскай міжрайінспекцыі. Каля здабытых жывёл, якіх яшчэ не паспелі разабраць і перамясціць, дзяржінспектары выявілі сляды аднаго і таго ж чалавека, як меркавалася, уладальніка карабіна. Характар раненняў жывёл на першы погляд таксама супадаў. Пазней ветурач і медыцынскі эксперт пацвердзілі, што і дзік, і казулі былі здабыты пры дапамозе адной зброі — наразной.

Паляўнічаму, які парушыў правілы, пагражае крымінальная адказнасць. Мсціслаўскі РАУС ужо завёў справу па частцы 4 артыкула 282 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь «Незаконнае паляванне». Не пазбегнуць мужчыне і пакрыцця шкоды — па 2,5 тысячы рублёў за кожную незаконна здабытую казулю.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# КАСМАЛОГІЯ ЛІШТВЫ



**— Самы стары драўляны дом, які ўдалося выявіць у Гомелі, быў пабудаваны ў 1860 годзе, — расказвае гісторык, кандыдат мастацтвазнаўства Яўген МАЛІКАЎ. — Ён і зараз стаіць на вуліцы Партовай. А на вуліцы Парыжскай Камуны знаходзіцца самы «разьбяны». Кожны такі прыклад унікальны, бо адлюстроўвае асаблівасці традыцый нашых продкаў.**

Яўген Раманавіч ведае пра драўляную архітэктуру горада над Сожам амаль усё. Амаль — таму, што заўсёды сам спадзяецца на адкрыцці і іх ажыццяўляе. Ён асабіста прайшоў дакладна па ўсіх вулачках Гомеля, дзе захаваліся дамы, пабудаваныя ў канцы XIX — першай палове XX стагоддзя. Вынікам стала кніга, прысвечаная традыцыям разьбянога дэкору ў народнай архітэктуры паўднёва-ўсходняй Беларусі. Яе і прэзентавалі ў Гомельскай гарадской бібліятэцы імя Герцэна.

Выпуск выдання як сацыяльна значымай літаратуры стаў магчымы дзякуючы заказу і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі. Рэцэнзенты лічаць, што яна будзе карыснай не толькі краязнаўцам, але і гісторыкам, архітэктарам, этнографам, мастацтвазнаўцам... Усім, хто цікавіцца традыцыямі народнай архітэктуры, якая па мастацкай значнасці ў адным шэрагу з традыцыямі ткацтва і іканапісу, якімі здаўна славілася Гомельшчына.

Старшы выкладчык кафедры архітэктуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарта Яўген Малікаў адзначае, што тэма драўлянага дэкору ў паўднёва-ўсходняй Беларусі мала даследаваная. Тым часам дамы імкліва змяняюць сваё аблічча да непазнавальнага:

— Мясцовыя жыхары далёка не ўсе разумеюць прыгажосць і каштоўнасць падобнай архітэктуры. Некаторыя ўвогуле кажуць, што старыя дамы час знесці і пабудаваць на іх месцы шматпавярховікі. Сёння людзі хочуць камфортна жыць, таму значна спрашчаюць фасады дамоў, якія дасталіся ім у спадчыну. Уладальнікі драўляных дамоў абшываюць іх сайдынгам, ставяць пластыкавыя вокны. Такім чынам знішчаецца індывідуальнасць дома, яго мастацкая каштоўнасць і адметнасць.

Мара Яўгена Малікава — стварыць квартал старога горада ў Гомелі. Менавіта таму ён фатаграфуе дамы такім чынам, каб па здымках можна было цалкам рэканструяваць пабудову. А збудаванні тым разам хутка знікаюць. Нават за час, пакуль кніга рыхтавалася да друку, у яе прыйшлося тэрмінова ўносіць карэктывы, бо яшчэ некалькі старых дамоў было знесена. Між тым, упэўнены Яўген Малікаў, драўляная забудова мае яшчэ і вялікі турыстычны патэнцыял.

Дарэчы, аздабленне драўлянымі «карункамі» дамоў — гэта не проста прыгажосць. Нашы продкі ўкладалі ў дэкор вялікі сэнс, які ідзе каранямі ў глыбокую старажытнасць, — падкрэслівае **дырэктар Веткаўскага музея стараабрадніцтва і беларускіх традыцый Галіна НЯЧАЕВА**:

— У любой народнай творчасці, у любой канструкцыі ў аснове мы маем касмалагічную мадэль сусвету. Згодна з ёй будаваліся калісьці і дамы. У ментальным сэнсе свет складаецца з трох частак: гэта нашы думкі, пачуцці і жарсці. І ўсе яны неабходны. Наверсе — бусел, у склепе — мышы. Пасярэдзіне кошка, якая ловіць і мышэй, і птушак і з'яўляецца медыятарам у доме. Дом пабудаваны так жа, і так жа ўладкавана акно ў ім. У верхняй частцы ліштвы стылізацыя пад верхні свет, сонца. Само акно з крыжам рамы — гэта дрэва нашага жыцця. Там, дзе мы нясём свой крыж, там, дзе мы з вамі знаходзімся. А ўнізе ліштвы можна пабачыць матывы рыбы, дракона, змей... Да таго ж, разьба заўсёды перадавала пачуцці майстра. У асобных майстроў на Гомельшчыне быў свой пазнавальны стыль разьбы. А ўзоры яны бралі са старажытных рукапісаў старавераў.

Толькі ў кнізе Яўгена Малікава прадстаўлена больш за 300 ілюстрацый драўляных твораў гомельскіх старажытных разьбяроў.

— Мне б хацелася, каб мае студэнты, калі будуць будаваць свае цудоўныя хмарачосы, улічвалі дэкаратыўныя асаблівасці нашага рэгіёна. Гэта зусім не азначае, што шматпавярховыя дамы трэба аздабляць драўлянымі ліштвамі, але пры іх праектаванні можна выкарыстоўваць нейкія дэкаратыўныя элементы і традыцыі, уласцівыя менавіта Гомельшчыне. Важна, каб дамы былі прыгожымі. А ў кожнай краіне гэтая прыгажосць мае свае адметнасці, і менавіта яны прыцягваюць цікавасць да рэгіёна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

■ Сталічныя хронікі

# ЛЁС «БЕЛЫХ НЯВОЛЬНІЦ»

## Цёмны бок жыцця дарэвалюцыйнай сталіцы

**Які вялікі пісьменнік-класік не закранаў тэму прастытуцыі ў сваіх творах? І сапраўды, глеба прыдатная, бо драматызму ў гісторыях дзяўчат, якія свядома ці несвядома выбралі гэтую «ніву», залішне. Мы пастараліся высветліць, наколькі супадалі літаратурная выдумка і рэальнасць жыцця ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя, дзе ў Мінску размяшчаліся «вясёлыя» кварталы і якім паўставаў зборны вобраз тагачасанай «жрыцы кахання».**

### Зарабіць на пасаг

Тое, што гэтая прафесія атрымала назву найстаражытнейшай, ні для каго не сакрэт. А вось з доказамі таго, што яе гісторыя налічвае тысячагоддзі, знаёмы нямногія. Аднак пра гэта згадваў яшчэ Герадот: ён сцвярджаў, што егіпецкі фараон Хеопс прымушаў дачку займацца прастытуцыяй і менавіта на гэтыя грошы пабудаваў сабе піраміду. Яна, у сваю чаргу, таксама не разгубілася: пэўную частку заробку адклала на ўнушальнае пахавальнае збудаванне для сябе. А гэта, заўважце, XXVI стагоддзе да нашай эры!

Як з іроніяй адзначыў **гісторык Уладзімір ЗЕЛЯНКОЎ**, нягледзячы на тое, што на нашых землях піраміды не будавалі, распаўсюджванне гэта «рамяство» атрымала вельмі шырокае. Траплялі ў яго па-рознаму, але часцей за ўсё — у пагоні за «прыгожым жыццём». Агенты хадзілі па вуліцах, прыкмячаючы дзяўчат, якія знаходзіцца ў цяжкім матэрыяльным становішчы, і прапаноўвалі ім высокааплатную работу, якая прадугледжвае знаёмства з заможнымі мужчынамі. Тая ж схема дзейнічае і да гэтага часу, толькі цяпер такім чынам завабліваюць за мяжу. Існавалі і больш завуаляваныя схемы: у газетах давалі аб'явы аб вакансіі пакаёўкі або эканомкі. Акрамя таго, быў і такі экстрэмальны спосаб «вярбоўкі» — проста схапіць дзяўчыну на вуліцы. На мяжы стагоддзяў у Беластоку існавала банда, якая дзейнічала менавіта такім чынам, пасля чаго перапраўляла «нявольніц» аж у Буэнас-Айрас. Аднак нельга сказаць, што Мінск выгадна вылядаў на фоне заходняга суседа. Напрыклад, у 1915 годзе ў «Нашай ніве» была апублікавана нататка аб тым, што на вакзале за адзін раз затрымалі 12 гандляроў «жывым таварам».

У канцы XIX стагоддзя ў Мінску пражывала каля 300 афіцыйна зарэгістраваных прастытутак. Пераважная большасць з іх былі з мяшчанскага асяроддзя, каля 20% — былыя сялянкі. Дзіўна, але дваранкі таксама сустракаліся — за вельмі рэдкім выключэннем. Што тычыцца паходжання, то каля паловы «дзяўчат лёгкіх паводзінаў» былі яўрэйкамі, што абумоўлена зусім не іх схільнасцю да гэтай справы, а было прама прапарцыянальна нацыянальнаму складу горада ў той час. На другім месцы па колькасці знаходзіліся рускія і беларускі, якія ў дакументах адносіліся да адной катэгорыі.



Асаблівую нішу займалі немкі: такім чынам яны зараблялі сабе на пасаг і, адпаведна, былі адзінымі, хто ведаў, што будуць займацца пасля заканчэння «кар'еры».

### Пад прыкрыццём капялюшных майстэрняў

Пасля выхаду ў свет рамана Аляксандра Дзюма «Дама з камеліямі», сюжэт якога потым быў пакладзены ў аснову оперы «Травіята», слова «камелія» атрымала яшчэ адно значэнне. Так пачалі называць элітных гетэр. У Мінску гэтыя вытанчаныя прыгажуні сустракаліся не часта, бо на той момант гэта быў хоць і досыць вялікі, але ўсё ж яшчэ далёка не сталічны горад. У асноўным мясцовыя «начныя матылькі» ледзь зводзілі канцы з канцамі.

Праблем было шмат: усё залежала ад тыпу арганізацыі дзейнасці, а іх існавала некалькі. Па-першае, былі адзіночкі, якія працавалі на суценёра, ці, як тады яго звалі ў заходніх абласцях Расійскай імперыі, — фактара. Дарэчы, у Маскве ён атрымаў куды больш любоўную мянушку — кот. Ён займаўся арганізацыяй працай: дамаўляўся з гасцініцамі, куды дзяўчат, калі ў іх не было заступніка, проста не пускалі. Увесь прыбытак фактар забіраў сабе, пакідаючы мінімум на пражыванне і «панчохі». Па-другое, многія арандавалі прыватныя кватэры, якія трымалі былыя «калегі». Умовы ў іх былі далёка не камфортнымі, што ніяк не суадносілася з вельмі высокай платай. Тым не менш знайсці іншае жыллё дзяўчыне з пэўным родам занятку і без «апекуна» было практычна не пад сілу. Самай нізкай катэгорыяй лічыліся «басаножкі», якія шукалі сабе заробак выключна на вуліцах горада.

Асабняком стаялі дамы цярпімасці. У іх для дзяўчат былі створаны найбольш прымальныя ўмовы жыцця. З заробку аўтаматычна вылічваліся грошы за прытулак, стол і вопратку, так што пра выжыванне размова не ішла, але і адкласці нейкую суму было практычна немагчыма. Таму выправацца з гэтага кола ўдавалася адзінкам, астатнія з узростам звычайна апускаліся ўсё ніжэй, заканчваючы жыццё на вуліцы. Паказальны факт: на ўвесь Мінск у тыя часы ўсяго ў трох прадстаўніц гэтай прафесіі было сваё жыллё.

Нараўне з работай у адкрытую гэтую частку свайго жыцця многія дзяўчаты альбо спрабавалі прыкрыць добрапрыстойным заняткам, альбо сумяшчалі і тое, і іншае. Асабліва такая практыка была распаўсюджана сярод швачак і мадыстак. Менавіта таму за капялюшнімі майстэрнямі замацавалася ў цэлым неадназначная слава.

### На вуліцы Вясёлай

Калі гаварыць пра мінскія «кварталы чырвоных ліхтароў», то адным з самых знакамітых быў участак ад вуліцы Багадзельнай да Губернатарскай, ці, кажучы сучасна мовай, ад Камсамольскай да Леніна. Тут размяшчалася мноства, каля 20, мэбляваных пакояў з рамантычнымі назвамі «Гамбург», «Страла», «Маларосія», «Аўстрыя», якія знаходзіліся пад кантролем фактараў. Нягледзячы на верагоднасць штрафаў, уладальнікі гасцініц таксама скрозь пальцы, у якія капалі няндрэнныя працэнты, глядзелі на тое, што адбывалася ў іх пад носам.

Летам дамы адпаведных паводзін шпацыравалі па Аляксандраўскім скверы. Уладальніцы больш высокага дастатку маглі дазволіць сабе аплаціць уваход на трэк у Губернатарскім садзе, цяперашнім парку Горкага, дзе збіралася свецкая публіка. У халодны час года «матылькі» перамяшчаліся ў кандытарскія і рэстараны.

Асяродкам дамоў цярпімасці былі Нова-Чырвоная і Вясёлая вуліцы. Нова-Чырвоная знаходзілася на месцы цяперашняй вуліцы М.Танка, дзе па меры набліжэння да татарскай слабады, у бок Свіслачы, сяліліся ўсё больш бедныя «паўшыя» жанчыны. Вуліца Вясёлая, больш вядомая для цяперашніх мінчан пад назвай Першамайская, як і Скобелеўская — Чырвонаармейская, знаходзілася паблізу салдацкіх казармаў і афіцэрскіх дамоў. Доля ваенных сярод наведвальнікаў падобных устаноў была настолькі высокая, што, калі летам яны адпраўляліся на зборы, прастытутак у горадзе практычна не заставалася — тыя накіроўваліся ўслед за гарнізонамі.

### Усё пад кантролем

Гэтую сферу паводле роду сваіх заняткаў актыўна вывучаў першы санітарны ўрач Мінска Пётр Грацыянаў, а затым і яго пераемнік — Сяргей Урванцоў. Пётр Грацыянаў нават адкрыў першы ў Мінску спецыялізаваны шпіталь для прастытутак у сваім уласным доме, які, нібы па іроніі, знаходзіўся на вуліцы Вясёлай. Бальніца фінансавалася са сродкаў горада, у ёй было 25 ложкаў плюс два запасныя, аднак гэтай колькасці часта было недастаткова.

Як адзначаў Грацыянаў, калі «дзяўчаты лёгкіх паводзінаў» лячыліся ў агульных шпіталях, яны лічыліся самым адчайным і недысцыплінаваным народам, але як толькі ў іх з'явілася свая медыцынская ўстанова, паступова змяніліся і не мелі права з'яўляцца туды ў п'яным выглядзе або дэбашырыць. Амаль усе ахвотна працавалі, шылі, вышывалі крыжыкам, любілі чытанне, аднак нельга было не адзначыць цяжкі псіхалагічны стан, практычна зломленую волю. У большасці назіралася схільнасць да рамантызму: яны выбіралі «свайго» кавалера, якому дарылі падарункі, захоўвалі яго фота і шчыра марылі пра каханне.

Ужо ў той час вяліся гарачыя спрэчкі аб тым, ці варта легалізаваць прастытуцыю. Звычайна гэта «рамяство» знаходзілася пад кантролем паліцыі, а ў Мінску — яшчэ і санітарнага камітэта. Ён быў створаны ў 1891 годзе па ініцыятыве гарадскога кіраўніка Караля Чапскага. Прадстаўнікі арганізацыі склалі велізарную пастанову на 48 пунктаў аб санітарным наглядзе за прастытуцыяй. Строгія меры далі свой плён: у Мінскай губерні быў адзін з самых нізкіх па ўсёй Расійскай імперыі ўзровень распаўсюджвання венерычных захворванняў.

У дзяўчат, якія траплялі ў афіцыйны спіс, адбіралі пашпарт і выдавалі «жоўты білет». Пазбавіцца ад яго можна было толькі па прычыне смерці, замужжа або афіцыйнага прашэння. З замужжам сітуацыя складалася неадназначная: нярэдка ўжо праз месяц навапечаная жонка вярталася да звыклага ладу жыцця. Афіцыйнае прашэнне падавалі, калі планавалі канчаткова змяніць род заняткаў. Падставы для яго адабрэння разглядаліся на пасяджэнні санітарнага камітэта.

Нягледзячы на дазвол займацца гэтай дзейнасцю, любыя яе сляды павінны былі быць прыкрытыя: ніякага крыклівага знешняга выгляду, гуляць у горадзе — толькі да гадзіны ночы, вокны дамоў цярпімасці заўсёды занавешаныя. Дарэчы, гэтыя «ўстановы» не маглі знаходзіцца ў цэнтры, а таксама ў жылых дамах. Таму легенда пра тое, што стары будынак журфака па вуліцы Мяснікова мае цёмную гісторыю, — хутчэй за ўсё выдумка, бо там размяшчаліся кватэры. Строга каралася сувязь з непаўналетнімі, а таксама суседства дамоў цярпімасці з піцейнымі ўстановамі.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ На слыху

# ХТО НА БОРЦЕ?

## Як здзіўлялі і чым уразілі прэтэндэнты на «Еўрабачанне-2017» ад Беларусі

**У апошні дзень восені Белтэлерадыёкампанія правяла чарговае музычнае тэсціраванне артыстаў, якія заявілі пра сваё жаданне прадставіць Беларусь у песенным конкурсе «Еўрабачанне-2017». Сёлета, трэба нагадаць, паспрабаваць свае сілы маглі не толькі беларускія выканаўцы, але і легіянеры, чым і скарысталіся грамадзяне Расіі, Украіны, Латвіі, Туркменістана, Германіі, ЗША і нават Нігерыі.**

Заяўкі на ўдзел у нацыянальным адборы даслалі 67 выканаўцаў і калектываў — дарэчы, гэта самая малая за апошнія 5 гадоў лічба (летась ахвотных было 84 чалавекі, у 2015 годзе — больш як 110, у 2013 — 2014 гадах — звыш 80). Магчыма, тут адыграў сваю ролю нашумелы ліст расійскага прадзюсара Максіма Фадзеева, які прапанаваў не каму-небудзь, а кіраўніку нашай дзяржавы, «у якасці падзякі» за ўчынак беларускіх паралімпійцаў у Рыа падрыхтаваць свайго артыста выступіць за Беларусь. Многія айчынныя выканаўцы сапраўды маглі палічыць, што плацдарм «загадзя падрыхтаваны» для фадзееўскага кандыдата, і вырашылі не распыляцца...

### Хто судзіў?

*У журы адборачнага тура ўвайшлі 9 чалавек з музычнай і медыйнай сферы, у тым ліку спявак і кампазітар Алег Аверын, кампазітар Дзмітрый Далгалёў, педагог па вакалу Людміла Куц, намеснік галоўнага дырэктара тэлеканала «Беларусь 1» Вольга Саламаха, прадстаўнік Міністэрства культуры Іна Мардусевіч, кіраўнік радыёстанцыі «Радыус-FM» Алена Трашчынская, тэлевядучыя Яўген Перлін і Міхаіл Равуцкі, PR-менеджар Сяргей Андрыянаў.*

Пуцёўку ў фінал па выніках праслухоўвання атрымалі ўсяго 13 кандыдатаў, многія з якіх ужо добра вядомыя публіцы, а другія толькі-толькі заявілі аб сабе: гурты Nuteki, NAVI і Napoli, праекты «PROвокация», Lermont x Julic, «Июль» (Юлія Каранюк), сольныя артысты Аляксандра Ткач, Kattie (Кацярына Рудніцкая), Уладзіслаў Курасаў, Анжаліка Пушнова, Анастасія Шавярэнка, Isaac Nightingale (Вадзім Капусцін) і Мікіта Ходас. Зрэшты, выбіраць самага перспектыўнага з іх беларусы — па традыцыйнай формуле галасавання 50/50 гледачы і журы — будуць толькі ў студзені наступнага года, таму часу пазнаёміцца бліжэй з прэтэндэнтамі ў нас больш чым дастаткова. Пакуль жа «Звязда», пабываўшы ў гушчы праслухоўвання, прадставіць тых, хто не заваяваў прыхільнасці журы, але так ці інакш вылучыўся і запомніўся падчас адбору.

### Музычны інтэрнацыянал

Ураджэнец Нігерыі **Аракпосім Оліса Эмека,** хоць і выглядае як замежны рэпер, насамрэч беларусам далёка не чужы — ён шмат гадоў жыве ў нашай краіне і ўжо мае від на жыхарства, амаль прафесійна гуляе ў футбол, займаецца бізнесам і спявае. Між іншым, у адборы на «Еўрабачанне» ён удзельнічаў ужо трэці раз, проста першыя два былі ў складзе гурта «The Champions». І, як на наш суб'ектыўны погляд, песня была прадстаўлена годна і з густам. Аднак судзейская калегія з намі не пагадзілася і зноў пакінула беларускага нігерыйца з яго чароўнай усмешкай і даўганогімі бэк-вакалісткамі па-за фіналам.

Не навічок на беларускай сцэне і спявак туркменскага паходжання **Шырмурад Чарыеў,** больш вядомы пад творчым псеўданімам Shir. Ужо 10 гадоў ён працуе ў сталічным Маладзёжным тэатры эстрады, дадаючы ў выступленні ўсходняга каларыту. Але для «Еўрабачання» артыст падрыхтаваў штосьці падобнае на стары хіт пра сцюардэсу па імені Жанна — і ў выніку застаўся ні з чым.


Віталь ВАРАНКО з камандай баян не парвалі, але адарваліся ад душы.

Не мела належнага эфекту і выступленне салісткі некалі вядомага гурта «Мантана» расіянкі **Алесі Берулава.** Дзяўчына парадавала хіба што яркім сцэнічным аблічам, але не сваёй новай песняй «Ёлачкі».

...Калі многія ўжо засумавалі ад мноства «прахадных» песень і падобных адзін на другі радыёхітоў, «дала дыхту» грамадзянка ЗША **Яўгенія Аронава,** якая выйшла на конкурсную сцэну пад псеўданімам Jeka:

— Прывітанне з Амерыкі! — кінула яна адразу ўсім і парадавала прысутных песняй у стылі «ліхіх 90-х», калі на сцэну лезлі і «жук і жаба», незалежна ад наяўнасці голасу. Гэты шэдэўр трэш-культуры можна было б нават назваць забаўным, калі б у ім прасочвалася хоць кропля самаіроніі ад выканаўцы. Але, не дачакаўшыся такога шчасця, журы ледзь вытрымала палову песні і паспешліва развіталася з артысткай.

### Стаўка на беларускасць

Тэндэнцыя, якая не магла нас не ўзрадаваць — даволі вялікая колькасць заявак на беларускай мове. Прычым традыцыйны стыль прыпевак і нацыянальных касцюмаў выкарыстаў толькі ансамбль **«Спасаўка»** з Жыткавіцкага раёна — гэтакі беларускі адказ «Буранаўскім бабулям», якія ўжо другі раз рызыкнуў штурмаваць «Еўрабачанне».

— Мяркуеце, народныя традыцыі могуць скласці канкурэнцыю ўсім гэтым англамоўным дзяўчатам у кароткіх спадніцах? — пацікавіліся мы ў кіраўніка калектыву Кацярыны Санец.

— Я разумею, што моладзі падабаюцца сучасныя песні, але і пажылым людзям трэба ўдзяляць увагу, тады ведаеце, колькі чалавек будуць гэты конкурс глядзець? — не разгубілася Кацярына Іванаўна. — А яшчэ мы перакананыя, што Беларусь павінна прадстаўляць на «Еўрабачанні» ўсё ж сваю мову і свае адметныя культурныя традыцыі!

Нібыта пагаджаючыся з бабулямі, гурт **«Superbullz»** на чале з вядомым у музычных колах вакалістам Алесем-Францішкам Мышкевічам прадставіў зусім іншую — жорсткую, брутальную і зусім нефарматную, затое яркую беларускамоўную песню «Адступіся!». Але, здаецца, хлопцы зусім не засмуціліся, атрымаўшы «ад варот паварот».

Акрамя вышэйзгаданых, беларускамоўныя песні ў розных жанрах і стылях прадставіў яшчэ дзясятак удзельнікаў, з якіх у фінал нацыянальнага адбору прабіўся толькі гурт **«NAVI».**

...Зрэшты, не будзем спяшацца: некалькі найбольш яркіх удзельнікаў праслухоўвання ўсё ж выступяць у фінальным канцэрце — у якасці спецыяльных гасцей. Таму чакаем студзеня — і выступлення, якое прымусіць запярэчыць Станіслаўскаму: «Верым!»

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

***Больш фотаздымкаў — на сайце zviazda.by***

## ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

# «НА СУВЯЗІ СА «ЗВЯЗДОЙ»

**I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1. Рэкламная гульня пад назвай «На сувязі са «Звяздой» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 7 снежня 2016 па 31 сакавіка 2017 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2017 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

**II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ**

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «На сувязі са «Звяздой» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда», — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ, руб. (у грашовых адзінках узору 2009 г./ узору 2000 г.) | Усяго з ПДВ, руб. (у грашовых адзінках узору 2009 г./ узору 2000 г.) |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Планшэт Asus ZenPad 10 Z300CNL-6A025A 000 | 1 | 508,90/ 5 089 000 | 508,90/ 5 089 000 |
| 2. | Мабільны тэлефон Fly FF241 чорны | 7 | 58,56/ 585 600 | 409,92/ 4 099 200 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «На сувязі са «Звяздой» складае: у грашовых адзінках узору 2009 г. — 918,82 (Дзевяцьсот васямнаццаць рублёў восемдзесят дзве) капейкі; у грашовых адзінках узору 2000 г. — 9 188 200 рублёў.

**III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ**

4. Рэкламная гульня «На сувязі са «Звяздой» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2017 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2017 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас установы ў перыяд з 7 снежня 2016 года па 5 студзеня 2017 года выразаная з газеты або з укладыша ў газету запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 7 па 31 снежня 2016 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі ва ўстанову пасля 11 студзеня 2017 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

**IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ**

9. Для правядзення Гульні «На сувязі са «Звяздой» установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Міхайлічэнка Алена Віктараўна — загадчык аддзела маркетынгу рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатольевіч — спецыяліст 1 катэгорыі адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

**V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ**

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 12 студзеня 2017 года ў 12 гадзін у памяшканні ўстановы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 мабільных тэлефонаў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — планшэт.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 22 студзеня 2017 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 22 студзеня 2017 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

**VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ**

16. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2017 года.

Пры звароце па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2017 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2016 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 31 сакавіка 2017 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 31 сакавіка 2017 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

**VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны ўстановай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «На сувязі са «Звяздой» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 284 44 04.

*Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №2901 ад 01.12.2016 года выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 422/U-39260 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Я. Купалы, 26 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 425850100003000331, (назначение – земельный участок для содержания и обслуживания жилого дома), площадью 0,1141 кв. м, расположенный по адресу: г. Щучин, ул. Я. Купалы, 26 |
| **Начальная цена продажи** | 30 472,80 р. (тридцать тысяч четыреста семьдесят два рубля восемьдесят копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 3 047 р. (три тысячи сорок семь рублей) |
| **Продавец** | ОАО «Щучинагропродукт», 231513, Щучинский р-н, д. Янчуки, тел. 8-01514-411-79 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Аукцион без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 21 декабря 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 04.08.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**
**Последний день приема заявлений – 15 декабря 2016 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта** | Право заключения договора аренды сроком на 3 года капитального строения, инв. № 400/С-92074 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административно-хозяйственное), арендуемой площадью 92,6 кв.м, по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 6А |
| **Начальная цена продажи** | 314,84 р. (триста четырнадцать рублей восемьдесят четыре копейки) с учетом НДС |
| **Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды** | 2,0 |
| **Сумма задатка** | 31 р. (тридцать один рубль) |
| **Условия аукциона** | Целевое назначение арендуемых помещений – для размещения склада, производственного помещения, офиса |
| **Продавец** | УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичская дистанция гражданских сооружений, 225407, г. Барановичи, ул. Вильчковского, 5, тел. 8-0163-42-25-08 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора аренды** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 04 января 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
- *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
- *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница)**
**Последний день приема заявлений – 28 декабря 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

**Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Мингорисполкома объявляет о проведении публичных торгов по реализации имущества, принадлежащего**

